ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 2 (5376)
ПЯТНІЦА
3
СТУДЗЕНЯ
1936 г.
Год выдання XIX

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ДА 60-ГОДДЗЯ ВІЛЬГЕЛЬМА ПІКА.
ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — У ВЫШЭЙШЫ КЛАС РАБОТЫ.
АГЛЯД ДРУКУ: «САКРЭТ» ПАДПІСКІ; НЕКУЛЬТУРНЫ ВЕРШ АБ КУЛЬТУРЫ.
С. ШУШКЕВІЧ — ДЗІКУНЫ.
ПІСЬМЕННІКІ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ — ІЛЬЯ ГУРСКІ.
ПЯТРУСЬ БРОЎКА — У АРАР АПКАЙ ДАЛІНЕ.
РАЗГОРНЕМ УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД ЗА 1000 ГЕКТАРАЎ НА ТРАКТАР.
ПЕСНІ І ЧАСТУШКІ КАЛГАСНАЙ ВЁСКІ.
СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫЯ БССР ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПЛАН ЗАГАТОВАК СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДУКТАЎ І СЫРАВІНЫ.
НОТА ПАЎПРЭДА СССР ВА УРУГВАІ.
ЛІКВІДАЦЫЯ «ЮЖАМТОРГА» ВА УРУГВАІ.

У вышэйшы клас работы!

Мінулы 1935 год быў годам велізарных перамог на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Следам за цяжкай прамысловасцю СССР, узначальваемай яе слаўным камандармам тав. **Серго Орджанікідзе** і чыгуначным транспартам, узначальваемым бліжэйшым саратнікам **Сталіна—Лазарам Мэйсеевічам Кагановічам**, датэрмінова выканалі свае планавыя заданні іншыя галіны прамысловасці і транспарту СССР. Датэрмінова, 12 снежня, упершыню за ўсе апошнія гады, выканала гадавы план і ўся прамысловасць БССР. На 20 снежня гадавы план выпуску прадукцыі саюзнай і рэспубліканскай прамысловасці БССР быў выканан на 103,7 проц. Адставаўшая таксама ўсе мінулыя гады прамысловасць промкааперацыі выканала свой гадавы план яшчэ 10 снежня на 102 процанты.

Наколькі велізарны поспехі прамысловасці БССР, ярка гаворыць тое, што толькі адно павелічэнне выпушчанай у 1935 г. прадукцыі ў адносінах да прадукцыі 1934 года ў два разы больш усёй прадукцыі прамысловасці дарэвалюцыйнай Беларусі.

Буйнейшая перамога большэвікоў і ўсіх працоўных Совецкай Беларусі дасягнута пры вялікай брацкай дапамозе Совецкага Саюза і асабліва рускага пролетарыята, пры любоўных і клапатлівых, сапраўды бацькаўскіх адносінах да нашай рэспублікі і нашага народу з боку вялікага правадыра народаў таварыша **Сталіна**.

Перамога гэта дасягнута на аснове ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, якая адрадзіла да жыцця беларускі народ, ператварыла Беларусь з убогай і жабрацкай царскай калоніі ў мінулым у адну з перадавых саюзных совецкіх рэспублік, народы якіх моцна спаяны вялікай дружбай, вялікім імкненнем мацаваць і мацаваць сваю соцыялістычную радзіму.

Перамога гэта дасягнута пад слаўным вадзіцельствам КП(б)Б, яе ЦК і выпрабаванага кіраўніка большэвікоў БССР — ордэнаносца таварыша **Гікало**.

Поспехі 1935 года асабліва рэльефна выступаюць на фоне работы прамысловасці ў мінулыя гады. У 1932 г. прамысловасць БССР выканала гадавы план толькі на 74,6 проц., у 1933 годзе — на 84,6 проц. і ў 1934 годзе — на 97,4 проц. У мінулым-жа годзе план не толькі выканан поўнасцю, але выканан датэрмінова на 18 дзён. Работа прамысловасці ў 1935 годзе характэрна і сваім роўнамерным, упэўненым рытмам, адсутнасцю ў асноўным практыкі рыўкоў, штурмоўшчыны. Значна палепшылася таксама выкананне якасных паказальнікаў. Выраслі кадры гаспадарнікаў.

Самае выдатнае ў мінулым годзе — гэта магутнае разгортванне народнага стаханаўскага руху, які з'яўляецца адказам працоўных мас на лозунг правадыра народаў таварыша **Сталіна**—«Кадры вырашаюць усё», на заклік правадыра аб аўладанні тэхнікай і скарыстанні яе да дна, аб уважлівых і чулых адносінах да жывых людзей, да кадраў.

Шырока разгорнуты стаханаўскі рух, творчая ініцыятыва найшырэйшых рабочых мас ускрылі багатыя рэзервы ў нашай прамысловасці. Старыя так званыя «тэхнічна ўгрунтаваныя» нормы перакрываюцца стаханаўцамі ў некалькі раз. Варта толькі напомніць аб такіх рэкордах, як сусветны рэкорд па лесапіленню рамшчыка Бабруйскага лесакамбіната т. **Рушко**, які 17 снежня распіляваў за начную змену на лесараме 560 кубаметраў драўніны, усесаюзныя рэкорды зменнага манцёра, брыгадзіра аўтаматнага цэха запалкавай фабрыкі «Везувій», ордэнаносца т. **Лучкоўскага**, які выпускае на сваім аўтамаце звыш 250 скрынак запалак за змену; рэкорды стругаля менскага гарбарнага завода «Большэвік» т. **Левіна**, які выконвае сваю норму па 300 проц.; усебеларускі рэкорд заціжчыка менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча т. **Грыгорыя Скабло**, які на гэтых днях запягнуў за змену 1.716 пар абутку, і шмат іншых.

Пачын перадавікоў становіцца ўсё больш і больш здабыткам шырокіх мас працоўных. Мы маем зараз тысячы і тысячы стаханаўцаў, якія ламаюць старыя погляды на тэхніку, старыя тэхнічныя нормы і ствараюць новыя, больш высокія нормы, ускрываюць багацейшыя рэзервы тэхнічнай магутнасці нашых прадпрыемстваў. Стаханаўскі рух узнімаецца на новую, больш высокую ступень. Праведзеныя радам нашых прадпрыемстваў, па вопыту Данбаса, стаханаўскія змены і дні палкам сябе апраўдалі. Характэрным прыкладам у гэтых адносінах з'яўляецца Бабруйскі лесакамбінат, які за стаханаўскі дзень 30 снежня выканаў свой дзенны план на 197 проц. Ад рэкордаў асобных рабочых перадавыя прадпрыемствы пачынаюць пераходзіць да рэкордаў цэлых змен, пэхаў.

Сваёй узорнай работай стаханаўцы ўнеслі многа паправак да плана 1936 года, які будзе сапраўды **стаханаўскім годам**. Вырысоўваюцца контуры грандыёзнай перспектывы. Многія прадпрыемствы, цэлы рад галін прамысловасці БССР (металапрамысловасць, шклопрамысловасць), падлічыўшы свае рэсурсы, абавязаліся выканаць сваю пяцігодку за 4 гады, даць краіне ў 1936 годзе на дзесяткі мільёнаў дадатковай, супроць спачатку запланаванай, прадукцыі, не затрачваючы дзяржаўных сродкаў на капітальныя ўкладанні, на новае абсталяванне.

Вось большэвіцкія вынікі магутнага стаханаўскага руху, натхнёнага геніяльнай прамовай таварыша **Сталіна** на ўсесаюзнай нарадзе стаханаўцаў!

З кожным днём усё больш і больш паляпшаецца матэрыяльна-бытавое становішча працоўных. Разгорнуты совецкі гандаль адкрыў доступ на рынак вялікай масе самых рознастайных прадуктаў і тавараў. Сярэднемесячная заработная плата аднаго рабочага ў пэнзавай прамысловасці за першыя 10 месяцаў 1935 года вырасла супроць адпаведнага перыяда 1934 года на 24 процанты. У той-жа час па асноўных прадуктах спажывання мы маем значнае зніжэнне цэн у параўнанні з мінулым годам.

Стаханаўскі рух ператварае нашу краіну ў самую багатую, у поўнай меры насычаную ўсімі рознастайнымі прадуктамі і таварамі.

Буйнейшыя дасягненні ў галіне прамысловасці аднак не даюць ніякага права на самасупакоенасць, на зазнайства, на пачыванне на лаўрах. Кіраўнікі прадпрыемстваў і інжынерна-тэхнічныя работнікі далёка яшчэ не ўсё зрабілі, каб «дапамагчы стаханаўцам разгарнуць далей стаханаўскі рух і распаўсюдзіць яго ўшыр і ўглыб». На многіх прадпрыемствах, трэба прама сказаць, яшчэ дрэнна арганізавана перадача і распаўсюджанне вопыту лепшых стаханаўцаў. Там стаханаўскі рух носіць усё яшчэ стыхійны характар, там рэкорды стаханаўцаў застаюцца здабыткам толькі адзінак.

Усе недахопы, недаробкі і хібы ў рабоце тых ці іншых участкаў прамысловасці павінны быць неадкладна выяўлены і па-большэвіцку пераможаны.

Пленум Цэнтральнага Камітэта Партыі, які адбыўся ў канцы снежня мінулага года, у прынятай рэзалюцыі па дакладах таварышоў Орджанікідзе, Любімава, Мікаяна, Лобава і Кагановіча вызначыў большэвіцкую праграму далейшага, яшчэ больш магутнага разгортвання стаханаўскага руху, указаў шлях перабудовы ўсёй прамысловасці і транспарту ў адпаведнасці з новымі перспектывамі, раскрытымі стаханаўскім рухам.

Рашэнні Пленума—баявая праграма штодзённых дзеянняў кожнага гаспадарніка, кожнага партыйнага і прафесіянальнага работніка, кожнага інжынерна-тэхнічнага работніка, кожнага рабочага.

Пад знакам ажыццяўлення рашэнняў Пленума Цэнтральнага Камітэта па-большэвіцку замацуем поспехі дасягнутыя прамысловасцю БССР у 1935 годзе, узорна выканаем стаханаўскую праграму 1936 года, перавядзем прамысловасць на новыя тэхнічныя нормы і магутнасці!

Нарада перадавікоў ураджайнасці па зярну, трактарыстаў і машыністаў малатарань з кіраўнікамі партыі і ўрада. НА ЗДЫМКУ: таварышы Сталін і Варашылаў у прэзідыуме нарады.
Фото Ф. КІСЛОВА і С. ЛАСКУТОВА (Саюзфото).

Разгорнем усебеларускі паход за 1000 гектараў на трактар

Да ўсіх трактарыстаў БССР

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Мы, дэлегаты Совецкай Беларусі, удзельнікі ўсесаюзнай нарады перадавікоў ураджайнасці па зярну, трактарных брыгадзіраў, трактарыстаў і машыністаў малатарань — брыгадзір трактарнай брыгады Капыльскай МТС Соня Рачок, трактарысты Хоцімскай МТС Змітро Ячмянёў і Раман Чубакоў, трактарыст Рэчыцкай МТС Іван Калінін, — выслухаўшы большасць выступаўшых на гэтай нарадзе трактарыстаў, пераканаліся, што нашы самыя высокія беларускія дасягненні трактарыстаў тт. Ячмянёва і Чубакова, выпрацаваўшых на трактары «ХТЗ» 708 гектараў, т. Калініна — 682 гектары, Соні Рачок, выпрацаваўшай у сярэднім на трактары ў сваёй брыгадзе 468 гектараў, — з'яўляюцца адныміз самых нізкіх норм выпрацоўкі ў параўнанні з тымі дасягненнямі, аб якіх расказвалі трактарысты іншых рэспублік і абласцей Совецкага Саюза.

Толькі на гэтай нарадзе мы зразумелі, што трактарысты ордэнаноснай Беларусі зусім недастаткова выконваюць важнейшыя ўказанні таварыша **Сталіна** «вышчыснуць з тэхнікі ўсё».

Мы слухалі выступленне Пашы Ангелінай — брыгадзіра жаночай трактарнай брыгады Старабешаўскай МТС, Данецкай вобласці, выпрацаваўшай у сярэднім на трактары сваёй брыгады 1.255,5 гектара. Мы слухалі выступленне тав. Гусева — брыгадзіра трактарнай брыгады Стаўбішчанскай МТС, Татарскай рэспублікі, выпрацаваўшага ў сярэднім на трактары 1.650 гектараў. Мы слухалі выступленне тав. Валошына — брыгадзіра трактарнай брыгады Ленінградскай МТС, Азова-Чорнаморскага края, выпрацаваўшага 1.671 гектар і зэканоміўшага 20.289 кілограмаў гаручага. Мы слухалі выступленні другіх трактарыстаў, якія дабіліся не менш бліскучых вынікаў. Мы іх слухалі і дзівіліся. У некаторых з нас нават з'яўлялася думка, магчыма ў нас другія ўмовы, кароткія загоны, што, моў, у нас не Украіна і не чорназёмная паласа. І таму ў нас выпрацоўка такая. Аднак, калі мы ўсё гэта добра прадумалі, то ўбачылі, што тав. Гусеў даў добрыя паказальнікі на сваіх трактарах зусім не таму, што яго ўмовы працы вельмі розняцца ад нашых, а таму, што ў яго брыгадзе цвёрдая дысцыпліна, дакладнасць у рабоце, добры догляд трактара і клапатлівыя, любоўныя да яго адносіны. З халастымі прабегамі тав. Гусеў змагаўся добрымі загадзя распрацаванымі маршрутамі, вывучэннем участкаў, дзе працуюць трактары, своечасовай і правільнай разбіўкай гэтых участкаў на загоны, разгортваннем сацыялістычнага спаборніцтва.

Тт. Валошын, Паша Ангеліна, т. Савін — брыгадзір трактарнага атрада Юдзінскай МТС, Заходнє-Сібірскага края, і іншыя дабіліся сваіх рэкордаў шляхам глыбокага вывучэння трактара, добрым веданнем людзей сваёй брыгады, правільнай арганізацыяй працы, строгім захаваннем графіка пераджальнага рамонту, чэснай работай і любоўю да самога трактара, падняццем культурнага ўзроўню трактарыстаў.

Якраз вось гэтага яшчэ не хапае трактарыстам нашай Совецкай Беларусі.

І вось мы, перадавыя трактарысты рэспублікі, прышлі да пераканання, што трактарам яшчэ як след не аўлалалі. А што гаварыць аб астатніх трактарыстах нашай рэспублікі, а іх у нас больш 10.000 чалавек? Ясна, што ўсё мы працуем яшчэ вельмі і вельмі дрэнна. Недарма-ж, таварышы, у ліку ўзнагароджаных Саюзным урадам трактарыстаў вы не знойдзеце нашых імён.

Мы варочаемся дадому з цвёрдым намерам ліквідаваць усе недахопы, якія яшчэ ёсць у нас у справе выкарыстання трактара.

На гэтай нарадзе наша **беларуская дэлегацыя выклікала на соцыялістычнае спаборніцтва дэлегатаў Чэрнігаўскай вобласці.** У гэтым спаборніцтве мы, трактарысты, узялі на сябе сур'ёзнейшыя абавязацельствы — даць **у 1936 годзе на кожны свой трактар не менш 1.100 гектараў.**

У гэтым спаборніцтве мы абавязаліся **АРГАНІЗАВАЦЬ УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД ЗА 1.000 ГЕКТАРАЎ НА ТРАКТАР.**

Мы заклікаем вас, таварышы трактарысты, дырэктары МТС, загадчыкі раённых зямельных аддзелаў, старшыні і брыгадзіры калгасаў, уключыцца ў гэты паход і дапамагчы нам правесці яго як мага больш паспяхова.

Мы ўзялі на сябе абавязацельства здаць у 1936 годзе тэхнічны экзамен на «выдатна» і заклікаем усіх трактарыстаў БССР здаваць тэхнічны экзамен таксама толькі на «выдатна».

Мы ўпэўнены, што наш зварот будзе падхоплен усімі трактарыстамі і вадзіцелямі сельскагаспадарчых машын. 1.000 гектараў на трактары «ХТЗ» і «СТЗ» будзе выпрацавана.

Ордэнаносная Беларуская рэспубліка павінна быць і будзе ў радах перадавых краёў, абласцей і рэспублік Совецкага Саюза па асваенню трактараў і сельскагаспадарчых машын.

Для таго, каб практычна вырашыць усе пытанні, звязаныя з узняццем прадукцыйнасці трактара, мы просім Наркамзем Беларусі ў бліжэйшыя дні склікаць нараду лепшых трактарыстаў рэспублікі.

З таварыскім прывітаннем трактарысты:

Рачок Чубакоў Ячменёў

Прамысловасць БССР выканала гадавы план 12 снежня

Саюзная і рэспубліканская прамысловасць БССР 12 снежня 1935 г. выканала зацверджаны ўрадам гадавы план па выпуску прадукцыі; на 20 снежня гадавы план выканан на 103,7 проц.

Прамысловасць промкааперацыі (Белкааппрамсовет, Белкааплеспрамсаюз і Белкаапінсаюз) выканала гадавы план па становішчу на 10 снежня на 102 проц.

УПРАЎЛЕННЕ НАРГАСУЧОТА БССР

Дзень ударніка — 11 студзеня

МАСКВА, 2 студзеня. (БЕЛТА). Прэзідыум ВЦСПС пастанавіў правесці ў 1936 годзе Дзень ударніка 11 студзеня.

Фабрычна-заводскім камітэтам прапанавана ўсю работу па падрыхтоўцы і правядзенню Дня ўдарніка накіраваць на арганізацыю дапамогі разгортванню стаханаўскага руху на аснове рашэнняў снежаньскага пленума ЦК ВКП(б).

СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫЯ БССР ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПЛАН ЗАГАТОВАК СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДУКТАЎ І СЫРАВІНЫ

25 снежня спажывецкая кааперацыя БССР выканала гадавы план загатовак асноўных сельскагаспадарчых прадуктаў і сыравіны: валакна на 101 проц., масла 100,1 проц., сыру 107,9 проц., бульбы 100 проц., па адгрузцы Ленінграду (датэрмінова) 103 проц., фруктаў на 131,1 проц., яек 124 проц., па дзяржаўных закупках мяса на 211 проц., пушніны 108 проц. і інш.

АБ ПРАПРАЦОЎЦЫ ВЫНІКАЎ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(Б) У ПАРТСЕТЦЫ

ПАСТАНОВА МЕНСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б АД 31 СНЕЖНЯ 1935 г.

Побач з прапрацоўкай вынікаў пленума ЦК ВКП(б) на партыйных і агульных сходах рабочых і служачых, прысвяціць два бліжэйшыя чарговыя заняткі ў партсетцы прапрацоўцы вынікаў пленума ЦК ВКП(б).

Сакратар Менгаркома КП(б)Б
ХАДАСЕВІЧ.

310 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ ПРЫБЫТКУ

Ільнозаводы Менскага ільнотраста на 1 студзеня 1936 года выканалі план 1935 года па доўгаму валакну на 129 проц., па кудзелі — на 107 проц. і па турбінных адыходах — на 120,6 проц. Усяго выпушчана прадукцыі 120,3 проц. плана, у колькасным выражэнні далі звыш плана 935,5 тоны прадукцыі замест узятых на сябе на першым злёце стаханаўцаў ільнаводства абавязацельстваў у 760 тон прадукцыі.

Адмовіўшыся ад датацыі, ільнозаводы Менскага траста ў чацвертым квартале 1935 г. далі прыбытку 310.000 рублёў.

Кіраўнік Менскага ільнотраста
СМОЛЬСКІ.

Сакратару ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО
Старшыні СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ
Старшыні ЦВК БССР—тав. ЧАРВЯКОВУ

Удастоеныя высокай узнагароды ад урада Саюза — ордэнамі «Працоўнага чырвонага сцяга» і «Знак почета» спяшаемся падзяліцца нашай радасцю з вамі тт. Гікало, Галадзед, Чарвякоў.

Завяраем ЦК партыі і ўрад БССР, што не спынімся на дасягнутых поспехах у нашых калгасах і соўгасах па ўраджайнасці зярна, якія лічым у параўнанні з другімі краямі, абласцямі і рэспублікамі ўсё яшчэ недастатковымі і будзем па-большэвіцку змагацца за выкананне ў гэтым годзе ўзятых на сябе абавязацельстваў — даць рэкордны ўраджай 30 і вышэй цэнтнераў з гектара і арганізаваць паход за 100 пудоў зернавых па Беларусі ў 1936 годзе.

Ф. П. Гарбуз, С. О. Бейне, М. І. Блоцкі, А. С. Юхневіч, В. П. Клішэвіч, Р. М. Бляхерава, І. Н. Знакаў, Ц. А. Юрасёў, В. Ф. Кулай, А. Е. Драгун, К. Е. Свірыд.

СТАХАНАЎЦЫ-ЛЕСАРУБЫ НА ПРЫЕМЕ Ў СТАРШЫНІ СНК БССР ТАВ. ГАЛАДЗЕДА

Учора старшыня СНК БССР тав. **Галадзед** прыняў дэлегацыю лепшых стаханаўцаў лясной гаспадаркі БССР.

У таварыскай гутарцы, якая працягвалася звыш двух з палавай гадзіны, стаханаўцы: шофер **Філонаў**, трактарыст **Грыгор'еў**, лесарубы **Пілік** і **Ільінчык Піліп**, гонтаразрэзчыца **Стаднікава**, машыніст **Позняк** расказалі тав. **Галадзеду** аб сваёй рабоце, як яны дабіліся высокай прадукцыйнасці працы.

Выступіўшы ў канцы гутаркі з прамовай тав. **Галадзед** паставіў перад стаханаўцамі і ўсімі рабочымі і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі лясной гаспадаркі рад задач па далейшаму разгортванню стаханаўскага руху і поўнаму забеспячэнню лесапрацоўчай прамысловасці БССР высокаякаснай сыравінай.

Асаблівую ўвагу звярнуў т. **Галадзед** на задачы поўнага скарыстання механізмаў. Вопыт лепшых стаханаўцаў-трактарыстаў, шофераў, машыністаў, якія ў два разы і больш павысілі сваю прадукцыйнасць працы, павінен быць шырока папулярызаваны на ўсіх механізаваных участках.

— Я ўпэўнен, — заявіў тав. **Галадзед**, заканчваючы сваю прамову, — што абавязацельствы, ўзятыя вамі па выкананню гадавога плана лесазагатовак і вывазак у першым квартале 1936 года, вы з гонарам выканаеце.

Вайна ў Абісініі

ІТАЛЬЯНЦЫ БАМБАРДЫРАВАЛІ ШВЕДСКІ ПАЛЯВЫ ШПІТАЛЬ

АДЫС-АБЕБА, 31 снежня. (БЕЛТА). На паўночным фронце войскі раса Хайолу, захапіўшы Абі-Аддзі паспяхова прасоўваецца к Сенору. Як відаць, абісінцы рашылі імклівым ударам з фланга і з фронта захапіць Аксум.

***

АДЫС-АБЕБА, 31 снежня. (БЕЛТА). У рэзультаце паветранай бамбардыроўкі, якой падвергся на паўднёвым фронце шведскі палявы шпіталь, размешчаны ў Нугелі, за 30 кілометраў на паўночны захад ад Доло, увесь медыцынскі склад з 9 шведскіх дактароў і 23-х абісінскіх памочнікаў, а таксама ўсе раненыя абісінскія салдаты, якія знаходзіліся ў шпіталі, забіты. Негус выказаў па тэлеграфу спачуванне сем'ям загінуўшых шведскіх дактароў.

***

ЛОНДАН, 31 снежня. (БЕЛТА). Замежныя дактары, якія знаходзяцца ў Адыс-Абебе, надзвычайна абураны паветранай бамбардыроўкай шведскага палявога шпіталя. Прадстаўнік міжнароднага Чырвонага крыжа паслаў рашучы пратэст у Жэневу. Бамбардыроўшчыкі ляцелі ніжа, так што лётчыкі не маглі не бачыць знакаў Чырвонага крыжа на палатках. Абурэнне ўзрасло пасля атрымання паведамлення, што ў часе бамбардыроўкі Дагга Бура ледзь не папярэдзіў егіпецкі шпіталь.

***

ПАРЫЖ, 31 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляюць парыжскія газеты, вестка аб знішчэнні італьянцамі шведскага шпіталя, арганізаванага і пасланага на грамадскія афяраванні, выклікала ў Стакгольме ўзрыў абурэння. Шведскія радыёстанцыі ў знак жалобы спынілі перадачу новагодняй музыкі. У Стакгольме вывешаны жалобныя сцягі. Італьянскае пасольства ў Стакгольме апэплена кардонам паліцыі.

ЗАБАРОНА ЗАКУПАК ТАВАРАЎ УРУГВАЙСКАГА ПАХОДЖАННЯ

На падставе пастановы ўрада, НК замежнага гандля забараніў з 1 студзеня 1936 года ўсім совецкім гаспадарчым арганізацыям рабіць закупкі тавараў уругвайскага паходжання. (БЕЛТА).

Манголія будзе мужна абараняць сваю незалежнасць

ІНТЭРВ'Ю ГЕНДУНА

У улан-баторскіх газетах (Улан-Батор — сталіца Мангольскай народнай рэспублікі) апублікавана інтэрв'ю старшыні Совета міністраў Мангольскай народнай рэспублікі Гендуна, данае 29 снежня 1935 года маскоўскаму карэспандэнту амерыканскага тэлеграфнага агенцтва «Асашыэйтэд прэс» Лойду.

Гендун даў адказ на рад пастаўленых пытанняў.

Дзеянні японска-манчжурскіх войск, сказаў ён, на граніцы МНР за апошні год, пачынаючы з вядомага нападу на мангольскія пагранічныя часці ў раёне Халхін—Сумэ 24 студзеня 1935 года, з дастатковай яснасцю гавораць аб іх **агрэсіўным характары і намерах.**

— Усе нашы просьбы пакінуць нас у спакоі, усе нашы спробы мірна дагаварыцца не далі ніякіх рэзультатаў.

Расказаўшы гісторыю перагавораў паміж МНР і Манчжоу-Го, Гендун падкрэсліў, што Мангольская народная рэспубліка не можа згадзіцца на тое, каб на яе тэрыторыі былі створаны пад выглядам прадстаўнікоў Манчжоу-Го японскія ваенныя місіі, дзейнасць якіх у мяжуючых з МНР раёнах Кітая добра вядома.

— Я думаю, — сказаў далей Гендун, — што падрыхтоўка да захвату МНР мае перш за ўсё сваёй мэтай ліквідацыю нашай незалежнасці і ператварэнне нас у другое Манчжоу-Го, адкуль лёгка будзе рыхтавацца да далейшых нападаў на Кітай і СССР.

— Мы не хочам быць уцягнутымі ні ў якія чужыя камбінацыі, мы абараняем і будзем абараняць свае ўласныя граніцы і сваю незалежнасць.

На пытанне аб дапамозе СССР у выпадку вайны Гендун адказаў, што **«МНР знаходзіцца ў цесных і прыязных адносінах з вялікім Совецкім Саюзам, з боку якога мы пастаянна сустракалі і сустракаем самыя ўважлівыя і прыязныя адносіны і падтрыманні».** — Кожны селянін МНР, — падкрэсліў Гендун,— ведае, што СССР — **наш друг**, бескарысліва зацікаўлены ў тым, каб МНР магла свабодна і мірна развівацца і квітнець. Усе мы разлічваем на тое, што СССР падтрымае нас у выпадку, калі мы зробімся афярай нападаў з боку захватчыкаў.

Што датычыць прыезду Гендуна ў Маскву, дык ён прыехаў, па прыкладу мінулага года, для вырашэння раду бягучых пытанняў.

Далей Гендун паведамляў **наступнае:**

— 19 снежня меў **месца новы налёт японска-манчжурскіх войск на нашу пагранічную заставу ў раёне** Булун-Дарсун. Ёсць весткі, што падрыхтоўваюцца новыя напады на тэрыторыю Мангольскай народнай рэспублікі. Мы заявілі пратэст ураду Манчжоу-Го і папярэдзілі яго аб цяжкіх выніках, да якіх могуць прывесці далейшыя спробы падобных нападаў, і ўсклалі адказнасць за гэтыя вынікі на Манчжоу-Го і Японію.

Мы, натуральна, абавязаны прыняць меры для таго, каб адстаяць сваю незалежнасць і не дапусціць уварвання захватчыкаў. **Сілы і рашучасць для гэтага ў нас ёсць.**

Увесь наш народ навучыўся цаніць дабро сапраўды свабоднага і незалежнага жыцця і поўны рашучасці абараняць сваю свабоду да апошняй кроплі крыві.

Захватчыкі павінны ведаць, што яны будуць мець справу не з прадажнымі генераламі і феадаламі, якіх японская ваенщчына прывыкла купляць і «перамагаць» без адзінага стрэлу. Яны будуць мець справу з усім мангольскім народам і ўрадам, які гэтымі народнымі масамі высунут і гатоў памерці за іх інтарэсы.

ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ РАБОТЫ

(ГУТАРКА З САКРАТАРОМ ОРГБЮРО МАЗЫРСКАГА АКРУГКОМА КП(б)Б т. АНАНЬЕВЫМ)

Пачалі мы сваю работу з прыёму партарганізацыі акругі ў часе праверкі партыйных дакументаў. Правядзенне гэтай велізарнай важнасці работы дало магчымасць азнаёміцца з партарганізацыямі, вывучыць іх кіруючы склад і пастаноўку партыйна-масавай работы.

Праверка паказала, што раённыя партарганізацыі акругі ў значнай меры былі засмечаны класава-варожымі элементамі і чужымі для партыі людзьмі.

Райкомы партыі ў большасці сваёй пытаннямі партыйнай вучобы займаліся ад выпадку да выпадку. У такіх раёнах, як Лельчыцкі і Капаткевіцкі, у летні перыяд школы і гурткі зусім не працавалі.

Недастаткова арганізавана праводзілася ў раёнах і палітмасавая работа на прадпрыемствах, у соўгасах і калгасах. Яна звычайна насіла выпадковы характар. Адсюль недастатковае вывучэнне райкомамі беспартыйнага актыва і вылучэння яго на ніавую кіруючую работу. У тым-жа самым Лельчыцкім раёне работы сярод аднаасобнікаў не было, у рэзультаце—калектывізацыя ішла вельмі павольна, дасягнуўшы толькі 64 процантаў.

Зыходзячы са становішча партыйна-масавай работы ў кожным асобным раёне, оргбюро акругкома распрацавала рад практычных мерапрыемстваў. Асаблівая ўвага звернута на лепшую арганізацыю і правядзенне партыйных сходаў, а таксама пастаноўку партыйнай асветы.

У гэтай галіне ўжо маюцца некаторыя зрухі. У кожным раёне арганізаваны і нядрэнна працуюць вячэрнія комвузы, соўпартшколы, гурткі па вывучэнню гісторыі партыі і т. д. Характэрна тая акалічнасць, што наведванне партыйных школ і гурткоў комуністамі амаль ва ўсіх раёнах дасягае зараз у сярэднім 90—95 проц. Тлумачыцца гэта, па-першае, тым, што ніавыя партарганізацыі сталі больш патрабоўнымі да сваіх комуністаў у адносінах партвучобы; па-другое, у саміх комуністаў з'явілася вялікая цяга да павышэння свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню.

Работа з комуністамі-адзіночкамі, асабліва на сяле, да праверкі партыйных дакументаў з'яўлялася адным са слабых участкаў работы партарганізацыі. У сваёй большасці комуністы-адзіночкі, што працуюць у калгасах і сельсоветах, былі прадастаўлены самі сабе.

Такое становішча ў значнай ступені тлумачылася тым, што комуністы-адзіночкі ў асноўнай сваёй масе былі распылены, іх амаль не збіралі, партыйную вучобу ў іх не арганізавалі. Для таго, каб палепшыць работу з адзіночкамі, оргбюро акругкома лічыць мэтазгодным правесці некаторую рэарганізацыю. Там, дзе ў адным сяле маецца больш трох комуністаў, працуючых у калгасе, сельсавеце, кааперацыі, школе, аб'яднаць іх у адну тэрытарыяльную пярвічную партарганізацыю, якая і павінна канцэнтраваць усю партыйна-масавую работу. З астатнімі комуністамі-адзіночкамі будзем праводзіць партыйныя сходы і партыйную вучобу па кустах.

Намецілася некаторы зрух у разгортванні палітмасавай работы ў калгасах. У большасці калгасных брыгад праводзяцца зараз кароткія палітінфармацыі па важнейшых падзеях міжнароднага і ўнутранога жыцця Совецкага Саюза. У прыватнасці, сярод калгаснікаў шырока прапрапоўваюцца апошнія прамовы таварыша **Сталіна.**

Галоўная ўвага оргбюро акругкома накіравана на ажыўленне партыйна-масавай работы. Аднак, бюро займалася і такімі важнымі гаспадарчымі пытаннямі, як становішча сельскай гаспадаркі ў акрузе і далейшыя задачы па яе ўздыму, уключаючы сюды ў першую чаргу павышэнне ўраджайнасці калгасных палёў і разгортванне больш узмоцненымі тэмпамі жывёлагадоўлі. Адным з асноўных мерапрыемстваў у гэтай галіне намячаецца правядзенне буйных меліярацыйных работ па асушэнню забалочаных плошчаў, ачыстцы лугоў і раскарчоўцы.

Значную ўвагу оргбюро аддае падрыхтоўцы кадраў для калгаснай вытворчасці. Па ўсіх раёнах арганізуюцца кароткатэрміновыя курсы старшынь калгасаў і брыгадзіраў. Такія-ж курсы арганізуюцца ў акруговым мэштабе. У некаторых раёнах райпарткомы прыступілі ўжо да арганізацыі курсаў парторгаў і прапагандыстаў.

Работа оргбюро мазырскага акругкома мела-б значна большыя поспехі, каб яна не была звязана з вялікімі труднасцямі арганізацыйнага перыяду. Шмат часу даводзіцца аддаваць оргбюро вырашэнню многіх дробных пытанняў. Апарат акругкома далёка яшчэ не ўкамплектаваны. Няма загадчыка сельскагаспадарчым аддзелам, культпропа і інструктароў. Аднак, оргбюро паступова ўваходзіць у сваёй рабоце ў нармальную каляю. Пачатак вялікай работы зроблен.

ПЕРШЫЯ КРОКІ МАСАВАЙ АГІТАЦЫІ

У Лепельскім раёне да апошняга часу зусім дрэнна была арганізавана масавая агітацыя сярод калгаснікаў.

На сходах калгаснікаў у большасці абгаварваліся пытанні гаспадарчага жыцця калгасаў і амаль зусім не ставіліся пытанні агульнапалітычнага становішча Совецкага Саюза.

У апошні час райком партыі рэгулярна, не менш аднаго разу ў месяц, склікае агульныя сходы калгаснікаў, на якіх абгаварваюцца пэўныя палітычныя пытанні (італа-абісінская вайна, стаханаўскі рух і т. д.).

Дакладчыкамі райком вылучае самых падрыхтаваных комуністаў з раённага актыва. Даклады робяць і члены бюро райкома і сакратар.

За некалькі дзён да схода калгаснікам паведамляецца аб тэме даклада і дні схода.

Праведзеныя чатыры сходы па ўсіх калгасах раёна ўзнялі палітычную актыўнасць калгаснікаў, іх зацікаўленасць да газетнага матэрыялу. Больш глыбока пачалі разбірацца ў газетных матэрыялах і цікавіцца асобнымі пытаннямі міжнародных падзей і вылучаныя дакладчыкі.

Гэту форму масавай агітацыі райком замацоўвае і ахапляе ёю ўсе калгасы раёна.

ДА 60-ГОДДЗЯ ВІЛЬГЕЛЬМА ПІКА

3-га студзеня 1936 года тав. Вільгельму Піку, прадстаўніку старой гвардыі КПГ, спаўняецца 60 год. Ён увасабляе гісторыю КПГ ад зачаткаў руху левых радыкалаў у германскай соцыял-дэмакратыі да комуністычнай партыі Германіі, якая гераічна змагаецца супроць фашысцкай дыктатуры.

Нарадзіўшыся 3 студзеня 1876 года ў ніжне-сілезскім тэкстыльным горадзе Губенс. Вільгельм Пік рос у душнай атмасферы рабалепства і ханжаства. Але ледзь скончыўшы ўбогую народную школу і чатырохгаловае вучэнне на столяра, юны рамеснік скінуў з сябе вузду, 18-ці год уступіў у «чырвоны» саюз дрэваапрацоўшчыкаў і 19-ці год — у соцыял-дэмакратычную партыю.

З 1896 па 1910 год Вільгельм Пік працуе ў Брэмене. Там у якасці нястомнага радавога партработніка і арганізатара палітасветнай работы ён заваёўвае давер'е да сябе. У цэнтральнай партшколе ён у 1907—8 г. завязвае цесную дружбу са сваімі настаўнікамі Францам Мерынгам і Розай Люксембург. У якасці дэлегата на парта'ездах ён выступае супроць рэвізіяністаў. Дзякуючы сваім здольнасцям ён у 1910 годзе займае пост 2-га загадчыка культурна-асветным аддзелам ЦК СПГ. Рэфармісцкая партыйная бюракратыя чакала, што на пасту партыйнага чыноўніка малады радыкал паступова ператворыцца ў паслухмянага функцыянера. Але здарылася адваротнае. Расшырыўшы свой кругазор, Вільгельм Пік стаў яшчэ больш варожа аднасіцца да рэфармісцкай палітыкі парткіраўніцтва, і 4 жніўня 1914 г. ён ужо ў радах невялікай, праўда, групы, якая змагаецца супроць ваеннай палітыкі соцыял-дэмакратыі. Разам з Розай Люксембург і Карлам Лібкнехтам Вільгельм Пік, адзін з прадстаўнікоў берлінскіх рэвалюцыйных рабочых, арганізуе ад імя групы «Інтэрнацыянал» рэвалюцыйную агітацыю ў краіне і ў маі 1915 г. узначальвае першую дэманстрацыю перад рэйхстагам, дзе яго і арыштоўваюць.

Пасланы пасля шасцімесячнага арышту на фронт, Вільгельм Пік пад Вердэнам, у бойцы на Соме і ў баях ва Фландрыі знаёміцца з жудасцямі імперыялістычнай вайны. Але ад чакаўшай яго «смерці героя» яго выратоўвае хвароба, якая прывяла яго ў лазарэт на радзіму. Не паспеў ён апраўіцца ад аперацыі, як яго зноў павінны былі адправіць на фронт. Але ён не падпарадкаваўся і быў за гэта прысуджаны да 5 год крэпасці. Яшчэ да разгляду паданай ім апеляцыі Вільгельм Пік уцёк і, знаходзячыся на нелегальным становішчы, зноў узяўся за рэвалюцыйную работу, пакуль саюз Спартак не адправіў яго ў Галандыю, дзе ён працаваў у рэдакцыі леварадыкальнага журнала «Кампф» і праводзіў рэвалюцыйную асветную работу ў масах уцёкшых у Галандыю дэзертыраў.

У кастрычніку 1918 года Вільгельм Пік зноў разам з толькі што выпаўшым з турмы Карлам Лібкнехтам, змагаецца за знаходзячыхся пад цэнтрысцкім уплывам хісткіх заводскіх упаўнаважаных, разам з Лібкнехтам у лістападзіскія дні кліча масы на барацьбу, разам з ім, часта з вінтоўкай у руках змагаецца ў студзеньскія дні 1919 г. і разам з ім арыштаваны і дастаўлены ў атэль Эдэн, ледзь выратоўваецца з рук забойцаў.

З 1918 года Вільгельм Пік — член ЦК КПГ. У рэвалюцыйных баях пасляваеннага часу, як і баях супроць растучага фашызма, ён заўсёды ў першых радах, і партыя даручае яму важнейшыя функцыі. Ён кіраваў Оргбюро КПГ, быў прадстаўніком партыі ў ВККІ, на кангрэсах і пленумах, быў дэпутатам ад Берліна ў прускім ландтагу з 1920 г. і ў райхстагу з 1930 г., быў прадстаўніком германскага МОПР з яго аснавання ў 1921 годзе і членам прэзідыума Міжрабпома.

Падобна Эрнсту Тэльману, з ранніх гадоў, знаходзячыся ў радах рабочага руху, падобна яму ўвасабляючы рэвалюцыйныя традыцыі германскага рабочага класа, Вільгельм Пік з'яўляецца лепшым намеснікам правадыра германскага пролетарыята, які ўжо каля 3-х год пакутуе ў засценку фашысцкіх катаў. Канферэнцыя КПГ, якая гераічна змагаецца супроць фашысцкай дыктатуры, паставіла Вільгельма Піка на час арышту Эрнста Тэльмана на чале партыі, перад якой стаіць задача: у найцяжэйшай абстаноўцы праводзіць у жыццё рашэнні VII сусветнага кангрэса; стварыць адзіны фронт з соцыял-дэмакратычнымі і беспартыйнымі рабочымі і ўстанавіць народны фронт усіх антыфашыстаў. У асобе прасякнутага юнацкім баявым духам тав. Вільгельма Піка рэвалюцыйныя рабочыя ўсіх краін вітаюць сваіх германскіх субратоў і клянуцца не аслабляць барацьбы за вызваленне Эрнста Тэльмана і ўсіх зняволеных антыфашыстаў.

□□□□□

Песні і частушкі калгаснай вёскі

Калгасная вёска спявае новыя песні і частушкі. Пра любімага Сталіна, пра заможнае калгаснае жыццё, пра магутнасць вялікай соцыялістычнай радзімы спявае вёска новага калгаснага ладу.

СТАЛІН

Наш любімы правадыр,
Наш любімы Сталін,
Мы заможнымі цяпер
У калгасе сталі!

Я ў калгасе навучылася
Па-большэвіцку працаваць
І я першая ўзялася
Болей лёну натрапаць.

Я жыву цяпер вясёла
І ў працы спор ідзе —
А да гэтага жыцця
Любы Сталін нас вядзе.

Дзякуй, наш любімы Сталін,
Дзякуй, наш любімы друг,
Што заможнымі мы сталі —
Я і шмат маіх падруг.

(Запісана будакашалеўскай раённай газетай «Ленінскі шлях»)

З ПЕСНЯЙ, ЗВАНЧЭЙ СТАЛІ...

Мы ідзем дарогай новай
З песняй, званчэй сталі.
Нас вядзе к соцыялізму
Наш вялікі Сталін.

Гэй, чырвоная каліна,
На табе шырокі ліст.
Пастухом быў Стась Марцінаў,
А цяпер ён трактарыст.

Ой, люблю, люблю глядзець
На нашага Грышку,
Ён чытае, вывучае
Сталінскую кніжку.

Дай нарад нам, брыгадзір,
Ударнае заданне:
На работу, як адзін,
Выйдзем заўтра рана.

(Запісана ў калгасе «Вольная праца», Рудня-Сяпецкага сельсовета, Аршанскага раёна, раённай газетай «Ленінскі прызыў»).

* * *

КАЛГАСНАЕ

Ты не лай мяне, мамаша,
Што так многа я раблю.
Гэта справа ўся наша, —
Працадзён больш зараблю.
Лодыр боцікі ваксуе —
У сваты сабіраецца.
Няхай едзе чым далей,
Не ён мне падабаецца.
А я мілку сваю ўзнаю
На калгаснай паласе:
Ў плашчэ белае адзета,
Чорна лентачка ў касе.
Я не бачыла мілога
Цэлых тры нядзелечкі.
На трактары не пазнала,
Пакажыце дзевачкі.

(Запісана тав. Мацюшонкам у калгасе «Ўсход», Сялібскага сельсовета, Бярэзінскага раёна).

НОТА ПАУПРЭДА СССР ВА УРУГВАІ

МОНТЭВІДЭО, 30 снежня. (БЕЛТА). Паўпрэд СССР ва Уругваі тав. А. Мінкін уручыў ноту міністэрству замежных спраў. У ноце гаворыцца:

— Маю гонар пацвердзіць атрыманне ноты вашага прэвасхадзіцельства ад 28 гэтага месяца, разам з якою мне вяртаецца пасля азнаямлення з яе зместам мая нота ад таго-ж чысла. Як ваша прэвасхадзіцельства магли заключыць з ясных і недвусэнсовых выразаў маёй ноты, аснову мая пратэст супроць абвінавачанняў, высунутых супроць майго ўрада і яго місіі ва Уругваі, і сцвярджэнне таго, што я катэгарычна адвяргаю факты, на якія ссылаюцца, каб абгрунтаваць гэтыя абвінавачанні.

У асаблівасці мая нота зводзілася да патрабавання асвятліць пры дапамозе дакументальнага доказу канкрэтнае абвінавачанне, згодна якому совецкая місія, нібы, перавяла ў Бразілію буйныя сумы грошай у чэках на прад'яўніка. Такое асвятленне і доказ не могуць прадставіць цяжкасцей, бо выданыя чэкі, нават калі яны аплачваюцца ў другой краіне, павінны быць вернуты той банкаўскай установе, праз якую аперуе чэкадаўцель.

З прычыны гэтага я дазваляю сабе настойліва прасіць аб тым, каб мне паведамілі падрабязнасці, указаўшы дату, суму, шумаючы і ўстанову, праз якую даны чэкі, якія, нібы, былі пераведзены гэтай місіяй і якія згодна ноце вашага прэвасхадзіцельства ад 27 гэтага месяца паслужылі падставай для «сур'ёзнага меркавання» аб фінансавай дапамозе, аказанай совецкай місіяй брамозе, аказанай совецкай місіяй бразільскім рэвалюцыянерам.

Я вельмі шкадую, п. міністр, што ваша прэвасхадзіцельства здзіўлена апублікаваннем маёй ноты па поваду перарыву дыпламатычных адносін паміж вашай краінай і СССР. Але гэтак пастуціла спачатку міністэрства замежных спраў, апублікаваўшы вашу ноту ад 27 гэтага месяца. Я лічу падобнае апублікаванне ноты ўзначальваемым вамі міністэрствам, адноль каква як і мной, зусім правільным і адпавядаючым гэтаму выпадку. Прымаючы пад увагу заяву вашага прэвасхадзіцельства аб тым, што не да месца ўваходзіць са мною ў дыскусію аб прычынах рашэння, на якому перарываюцца дыпламатычныя адносіны паміж нашымі краінамі, я ўсё такі не магу ў гэтай ноце не ўказаць на тое, што дыпламатычны прадстаўнік у падобным выпадку заўсёды мае права, згодна нормам міжнароднага права, паступіць так, як я паступіў.

„ЭВР" аб разрыве дыпламатычных адносін паміж СССР і Уругваем

ПАРЫЖ. Газета «Эвр» выкрывае недаречны характар «тлумачэнняў», якія прыводзяцца ў ноце уругвайскага ўрада з поваду разрыву адносін з СССР.

«Ах, гэтыя жахлівыя большэвікі! — піша газета, — яны хацелі распаліць паўстанне на ўсім кантыненце... На шчасце, уругвайскі ўрад пільны, ён уручыў пашпарты прадстаўнікам совецкай і тым выратаваў усю паўднёва-амерыканскую цывілізацыю. У Буэнос-Айрасе (Аргентына) у Рыо-дэ-Жанейро (Бразілія) і ва ўсіх суседніх сталіцах задавальненне поўнае. З гэтага часу мір будзе панаваць ва ўсіх рэспубліках Паўднёвай Амерыкі, і не прыдзецца гаварыць больш аб змовах і дзяржаўных пераваротах. Карацей кажучы, законнасць забяспечана назаўсёды.

Але ў сапраўднасці якія доказы даюцца адносна «змовы Масквы»? Уважліва чытаючы тэлеграмы з Монтэвідэо, не знаходзіш ніякіх доказаў. Не знаходзіш нічога, акрамя ўказання, што ў лістападзе разрасілася ў Бразіліі рэвалюцыйнае паўстанне. У гэтай краіне таксама выкрыты «інтрыгі Масквы». У сапраўднасці-ж справа ішла аб ваенным паўстанні, арганізаваным нейкім Прэстэсам. Што гэты кадравы афіцэр быў ахвячэн уплывам большэвізма — гэта магчыма; але чаму-ж маскоўскі ўрад павінен за гэта адказваць?».

«Той, хто колькі-небудзь сочыць за палітычным жыццём у Паўднёвай Амерыцы, — гаворыць далей газета, — ведае, што кіраўнікі паўднёва-амерыканскіх рэспублік, якія кіруюць у большасці з дапамогай крубага насілля, маюць прывычку абвяшчаць комуністычнымі ўсякія рухі неадавальнення, якія за апошнія гады множацца пад уплывам эканамічнага крызісу.

Што-ж датычыць Уругвая, забаўна бачыць яго ўрад у ролі прыхільніка законнасці, калі ўспомніць, што прэзідэнт рэспублікі Тэрра з'яўляецца ўзурпатарам, зрабіўшым дзяржаўны пераварот 31 сакавіка 1933 года і прыняўшым на сябе надзвычайныя паўнамоцтвы з дапамогаю ваенных клік».

Артыкул заканчваецца ўказаннем, што дыпламатычны інцыдэнт паміж Уругваем і СССР, незначны сам па сабе, раздуваецца тымі органамі друку, варожасць якіх да існуючай у СССР сістэмы агульнавядома, і ў прыватнасці гітлераўскім друкам.

ЛІКВІДАЦЫЯ „ЮЖАМТОРГА" ВА УРУГВАІ

Па прапанове Народнага камісара знешняга гандля СССР тав. Розенгольца, совецкія гаспадарчыя арганізацыі, якія з'яўляюцца ўладальнікамі большасці акцый уругвайскага таварыства «Южамторг» (праз якое праводзіліся ўсе знешнегандлёвыя аперацыі паміж СССР і Уругваем) прынялі рашэнне аб скліканні экстранага схода акцыянераў «Южамторга» з мэтай ліквідацыі яго.

* * *

Гандлёвы абарот СССР з Уругваем за апошнія гады характарызуецца наступнымі данымі:

	Вываз з СССР ва Уругвай	Прывоз з Уругвая ў СССР	Сальдо гандлёвага баланса ў карысць Уругвая
1934 г. . . .	1.267 тыс. р.	2.092 тыс. руб.	+825 тыс. р.
1935 г. (11 м.)	513 тыс. р.	1.475 тыс. руб.	+962 тыс. р.

Асноўнымі артыкуламі нашага імпарту з Уругвая з'яўляліся скурсыравіна і шэрсць. Як відаць з прыведзеных даных, Уругвай у сваіх гандлёвых абаротах з СССР меў рэзка выражаны актыўны гандлёвы баланс. За 11 месяцаў 1935 года прывоз з Уругвая ў СССР амаль у тры разы перавысіў вываз нашых тавараў ва Уругвай.

Склад совецкага імпарту ва Уругвай — у асноўным нафтапрадукты, лесаматэрыялы і тавары промэкспарту — такі, што гэтыя тавары лёгка можна рэалізаваць на іншых рынках. Апрача таго Уругвай ніколі не граў колькі-небудзь прыкметнай ролі ў якасці рынка для экспарту совецкіх тавараў. Наадварот, зацікаўленасць Уругвая ў совецкіх заказах не падлягае ніякаму сумненню, як у сілу рэзкай актыўнасці для Уругвая гандлёвага баланса з СССР, так і ў выніку таго, што СССР імпартаваў важнейшыя рэчы уругвайскага экспарту.

У АРАРАЦКАЙ ДАЛІНЕ

(ДАРОЖНЫЯ НАТАТКІ З ПАЕЗДКІ ПА АРМЕНІІ)

* * *

Пятрусь БРОУКА

* * *

Мы едзем па Араратскай даліне на свята ў калгас Ардашат, Камарлінскага раёна. Пачатак снежня. І хоць на дварэ яшчэ зусім цёпла, вінаградныя лозы перагнуты і абкапаны зямлёю. Невялікі дождж крыху перашкаджае нам: ён хавае ад нас гарызонты і Арарат, які так добра відзен у пагоду, недзе знік у імгле. Зямля такая глейкая, што калі ступіш на размяклую дарогу, ледзь выратуеш ногі, — яны быццам прырастаюць да яе, і нядзіўна, што нашаму шоферу давялося многа папрацаваць і перажыць буксовак, пакуль мы даехалі з Эрывані ў Ардашат.

Але, не гледзячы на гэта, наша ўнутранае хваляванне ў чаканні свята ўзнялося яшчэ далёка да Ардашата. На сярэдзіне дарогі, на ўсіх перакрыжаваннях, на ўсіх мастах яшчэ кілометраў за 20 да месца свята велізарныя групы калгасных коннікаў сустракалі машыны з дэлегацыямі братэрскіх рэспублік і прадстаўнікамі свайго ўрада магутным «ура». І здавалася, няма канца той вялікай урачыстасці, якая ахапіла ў гэтыя дні ўсю Арменію.

15 гадоў назад, у канцы лістапада 1920 года, працоўнае насельніцтва Арменіі, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, прагнала контрэволюцыйную партыю дашнакоў і пачало сваё сапраўднае жыццё. Армянскі працоўны народ перажыў такія беды, што хіба толькі суд Лінча мог здзівіць яго. Таму і бязмежна радасць яго ў дні вызвалення. Конныя раз'езды калгаснікаў усю дарогу сустракалі нас. Вёскі, праз якія мы праязджалі, былі па-святочнаму прыбраны. Аркі, упрыгожаныя чырвонымі палотнішчамі, каля іх некалькі столікаў. На століках пачастункі гаспадароў: цюарта, лаваш, вінаграднае віно. Натоўпы калгаснікаў сустракалі прывітальнымі крыкамі, спынялі машыны і патрабавалі абавязкова папрабаваць частункаў, якіх так багата выставілі самыя гасцінныя гаспадары. Чым бліжэй да Ардашата, народ на дарозе ўсё прыбаўляўся. Гоману больш і больш. Ужо чуваць як загаварылі зурны і загудзелі тары. Нарэшце — Ардашат.

Хаты цяжка разгледзець за народам. Натоўпы сталі пазабапал вуліцы, — спяваюць, іграюць на зурнах, страчаюць гасцей. І зноў частункі, толькі тут у многа разоў гусцей. Літаральна праз кожныя 3—4 хаты — стол, накрыты чыстым абрусам, з гарою закусак і віном. Сівыя дзяды запрашаюць да сталоў. Яны трымаюць у руках талеркі з налітымі шклянкамі віна і талеркі з ядою; відаць, як яны ад усяго сэрца хочуць падзяліцца сваёй невыказнай радасцю, і як загараюцца іхныя вочы, калі госці прымаюць частунак.

— Зэркі нац!.. Зэркі нац!.. — радасна шэпчуць яны ўслед і радасна пераглядаюцца паміж сабою.

У Ардашаце многа новых дамоў, якія пабудаваны па-сучаснэму і тым ажыўляюць пахмуры, замкнуты стыль старой армянскай вёскі. Вуліца там — крэпасць. Па двух баках яе, паміж хат, высокія, лепленыя сцены. Вокны звычайна выходзілі на двор. Кожны двор, апрача таго, меў яшчэ свае асобныя сцены. І нядзіўна, што вёска так будавалася, калі апавядаюць, што нават у Эрывані ў часы дашнакскага ўладарства пасля ночы на раніцу знаходзілі на вуліцах дзесяткі трупаў. Вёска мусіла бараніцца ад усялякіх набегаў, і яна абносілася вялікімі сценамі.

А цяпер мы ўбачылі новы Ардашат, які рэзка выдзяляецца са старога. Зграбна пабудаваныя домікі з роўнымі стрэхамі на некалькі пакояў, з шырокімі вокнамі на вуліцу. Калгасны брыгадзір вядзе нас то ў адзін, то ў другі домік, і ўсюды мы бачым выключную чыстату, прыгожа развешаныя каўры на сценах, новую мэблю. Унутраны выгляд адразу гаворыць, што нават сярэдні ардашацкі калгаснік жыве заможна.

Калгаснікі з дэлегацыі братэрскіх рэспублік акружылі ў садзе калгаснага брыгадзіра з Ардашата, закідалі яго практычнымі пытаннямі. Асабліва выдзяляўся наш брыгадзір з калгаса «Чырвоны Бераг», Аршанскага раёна, т. Бондараў. Ён літаральна пытаўся пра ўсё, — як арганізавана праца, колькі налічаецца на працадзень, і было відна, што ён усім задаволены, толькі не задаволіўся ўчотам, — чаму кожны дзень калгасны брыгадзір не здае ўчоту працы ў кантору, і тут-жа, а потым пазней, на вечары, седзячы побач са сваім таварышам — армянскім брыгадзірам, усё апавядаў таму, як пастаўлена справа ў яго калгасе «Чырвоны Бераг», за некалькі тысяч кілометраў ад Ардашата. І яны разумелі адзін другога.

І нам, некалькім літаратарам розных рэспублік, давялося зайздросціць іх узаемнаму разуменню і зацікаўленасці да работы адзін другога. Яны не толькі абмяняліся прывітаннямі і пажаданнямі на далейшае, як гэта часта робім мы, а тут-жа пачалі пасабляць таварыш таварышу па рабоце. І гэта сапраўднае братэрства народаў, бо дзе гэта і калі магло быць, каб беларускі селянін так перажываў за гаспадарку армянскага селяніна, ці, наадварот, як гэта было на свяце ў Ардашаце. Калектыўная гаспадарка прывяла да дружбы і ўзаемнага разумення. І мы бачылі, як нашы брыгадзіры проста, па-сяброўску праводзілі ўсё свята ў таварыскіх размовах разам.

На агульны калгасны двор прыгналі каля трыццаці асядланых коней. Калгаснікі Ардашата не хацелі, каб госці аглядалі ваколіцы калгаса пехатою, і праз некалькі хвілін многія з нас, першы раз у жыцці стаўшы коннікамі, паехалі па вуліцы. Рознае адзенне, пасадка на кані шмат каго з нас прыводзілі ў захапленне ардашацкіх калгаснікаў. І яны пляскалі ў далоні, крычалі і заліваліся ад смеху. Брыгадзір з калгаса Ардашат пусціў свайго каня на-выскачкі. Невялічкія пягавітыя конікі з Араратскай даліны не прызвычаіліся заставацца, і мы мімаволі перайшлі ў галоп, з гонарам трымаючыся ў сядле. Нават нашы дзве жанчыны, калі прыехалі да першага прыпынку ля калгасных яслей, важна заявілі, што ім ездзіць не навіна і яны сябе добра адчуваюць, хоць у часе язды яны вельмі многазначна пераглядваліся паміж сабою з некаторымі зменамі ў колерах твару. Але экзамен верхавой язды быў вытрыман усімі і, я думаю, што зварот наш назад выклікаў ужо сапраўдныя захапленні ардашацкіх калгаснікаў аб нашай спрытнай яздзе верхам.

Калгасныя яслі пабудаваны вельмі добра. Там 6—7 пакояў выключнай чыстаты. Падлога пафарбаваная. Невялічкія ложкі засланы чысцейшай бялізнай. Нас прапускалі невялічкімі групамі апранутых у белыя халаты. Дзяжурны фельчар тлумачыў нам пастаноўку справы, і нас непакоіла толькі адно, што мы перашкодзілі маленькім калгаснікам Ардашата гуляць у пашкі. Яны стаялі ў баку і з цікавасцю разглядалі нас.

Па дарозе ад яслей да школы-дзесяцігодкі да мяне пад'ехаў ардашацкі калгаснік. Я прыгадаў яго, калі ён стаяў на левым крыле трыбуны ў Эрывані. Ён сам мне ўспомніў пра гэта.

— Як было ў Эрывані?—спытаўся ён, і па яго твару я бачыў вялікае ўнутранае задаволенне парадам 30 лістапада. Так, сапраўды было чым ганарыцца. На гэтым парадзе была ўся Арменія, як на далоні. Усе галоўнейшыя прадпрыемствы краіны ў мініяцюрным выглядзе былі паказаны ў дзеянні на аўтамашынах: эрываньскі кансервовы завод, завод сінтэтычнага каўчуку, Карагадгрэс, Арарат і шмат іншых. Калгаснікі праязджалі са сваімі экспанатамі, караваны вярблюдаў везлі бавоўну ў падарунак святу і праходзілі каля трыбуны. Усё было так арганізавана, што выклікала толькі захапленне. Скокі, зурны, песні толькі ўпрыгожвалі магутны паступ новай соцыялістычнай краіны перад урадам, перад усесаюзным старастам Міхаілам Іванавічам Калініным.

Армяне, курды, цюркі дружнай сям'ёю праходзілі, скакалі на конях, ехалі на вярблюдах, і ўсюды была відна вялікая дружба народаў. І як нікчэмна выглядала ўладарства дашнакоў, разбурыўшых краіну, так добра паказанае на парадзе!

Мой знаёмы ўсміхаецца, калі я з захапленнем гавару пра гэта, і ў сваю чаргу ставіць пытанне:

— Міхаіла Іванавіча бачылі?..

— А як-жа!..

— І я таксама!..

І гэта гучыць так шчыра, цёпла і радасна...

Дзесяцігодка ў калгасе нікольки не розніцца ад сталічных школ. Новы вялікі будынак, светлыя, чыстыя класы, добрыя школьныя парты, удала абсталяваныя розныя габінеты. Мы агледзелі школу і накіроўваліся, каб глянуць яшчэ на якія калгасныя ўстановы, але вялікі шум і крыкі «ўра» з цэнтра калгаса прымусілі нас спяшацца туды. Мы здагадаліся, што прыехаў на свята сакратар ЦК КП(б)А тав. Ханджан і мітынг павінен пачацца.

Так і было. На вялікай калгаснай плошчы было столькі народу, што мы ледзь прайшлі да трыбуны. Мітынг пачаўся. Армянскіх калгаснікаў віталі са святам прадстаўнікі Ленінграда, Украіны, Беларусі, Туркменістана, Грузіі. І кожная прамова выклікала вялікі ўздым прысутных. Людзі гаварылі на розных мовах, але добра разумелі адзін другога, яны ведалі, што свята Арменіі — свята ўсяго Совецкага Саюза. Горача гаварыў тав. Ханджан, і бясконцыя воплескі часта перарывалі яго прамову.

Увесь вечар пасля мітынгу заняў вялікі калгасны банкет. На ім прысутнічала каля 200 чалавек. І кожны быў задаволены, бо на сталах стаяла так многа ўсяго, бо было так весела і прыемна. Спявалі спевакі. Гаварылі прамовы. Цалаваліся. І наш дэлегат, брыгадзір калгаса «Чырвоны Бераг», Аршанскага раёна, ці не першы пачаў гэта. Мы заўважылі, як ён раней за ўсіх пацалаваўся з брыгадзірам армянскага калгаса Ардашат. Яны доўга ціснулі рукі адзін другому.

І калі позна ноччу мы вярталіся ў Эрывань, мы бачылі, як на працягу 20 кілометраў ад Ардашата ўсё яшчэ стаялі калгасныя раз'езды. Прычына была вядома: яны баяліся, каб машына не завалі ў дарозе.

Як цяжка было развітацца з імі, з іх слаўным Ардашатам. Але гэтага вядзе нас дружба.

Прыехалі. Эрывань. Сталіца.

АГЛЯД ДРУКУ

„САКРЭТ“ ПАДПІСКІ

Старшыням калгасаў «Чырвоны Кастрычнік», «Дружба» і імя Молатава, Журавіцкага раёна, тт. Вінакураву, Зянькову і Шыловічу дасталася не мала ад раённай газеты «Сталінец». Рэдакцыя абвясціла іх зрыўшчыкамі падпіскі на мясцовы друк. Яна абураецца тым, што Зянькоў на 150 калгасных двароў выпісаў у лістападзе 1 экземпляр газеты.

Чаму-ж калгаснікі так дрэнна чытаюць сваю раённую газету? Не гледзячы на тое, што яна публікуе кантрольныя лічбы, падпіска, відаць, ідзе слаба.

Возьмем нумары газеты за лістапад—снежань. Журавіцкага калгасніка цікавіць, што робіцца у Совецкім Саюзе, па рэспубліцы, за граніцай. Між тым, матэрыял аб усім гэтым падаецца выпадкова. Аб падзеях у Абісініі—не больш двух-трох раз. Не знойдзе чытач у газеце амаль ніякіх навін і па раёну.

А мова? Што можна зразумець, напрыклад, у такім вызначэнні, як «гадавы план мабсродкаў», або «райкнігарня». Да матэрыялу аб ільне газета дае «шапку»: «Усе сілы на барацьбу за лён», а да фінансавага матэрыялу — «Максімум сіл на ліквідацыю прарыву».

Падпіску безумоўна трэба арганізоўваць, але калі газета будзе дрэннай, то наўрад ці дапамогуць кантрольныя лічбы і абурэнне па адрасу старшынь калгасаў. «Сакрэту» падпіскі трэба шукаць у іншым.

—о—

НЕКУЛЬТУРНЫ ВЕРШ АБ КУЛЬТУРЫ

Мясцовы паэт у № 108 брагінскай раённай газеты «Трыбуна калгасніка» змясціў свой верш. Пачынаецца ён, так сказаць, з невялічкага гістарычнага экскурсу:

Хадзіла, брадзіла, моладзь брагінская,
Ды абрыдла ўжо тратуары ламаць
І парашыла яна, доўга не думаючы,
Заглянуць у брагінскі клуб пагуляць.

У клубе брудна, печы не топлены. Дырэктар, комсамолец Сачок п'янствуе. Аўтар сароміць Сачка і заклікае да яго грамадзянскіх пачуццяў:

Ды к таму ты, Сачок, комсамолец,
Які культуру павінен насіць...

У заключэнне аўтар патрабуе ад раённага камітэта комсамола «мікстуру» для Сачка, «каб у клубе стала ўтульна і культурна». На гэту бязграматную пісаніну газета патраціла каля ста радкоў буйнага тэксту.

Раённая газета павінна займацца літаратурнымі справамі. У калгасах Брагінскага раёна, безумоўна, ствараюцца цікавыя народныя творы, але газета імі не цікавіцца. Трэба друкаваць матэрыялы мясцовых пачынаючых пісьменнікаў і паэтаў, але неабходна друкаваць культурны, граматны матэрыял.

НЕПАРАДКІ НА МЕНСКАЙ ФАБРЫЦЫ-КУХНІ

(ПІСЬМО ГРУПЫ «ЛЕГКАЙ КАВАЛЕРЫІ»)

Менская фабрыка-кухня існуе амаль год. За гэты час кіраўніцтва фабрыкі-кухні (дырэктар Карначоў) усё яшчэ не зделала нармальна наладзіць работу.

На фабрыцы павінна сталавацца 4—5 тысяч студэнтаў, а абедаў для іх гатуецца значна больш, бо не налажан улік сталуючыхся. Якасць абедаў далёка нездавальняючая. Былі выпадкі, калі ў абедзе знаходзілі цвікі, іголкі, шкло. Спасылаючыся на тое, што электрастанцыя не падае вады, вячэра амаль ніколі не гатуецца.

Кухня знаходзіцца ў антысанітарным становішчы. Падлога мыецца рэдка. Няма гатаванай вады, пляваральніц. Работніца Савіч пасуду мые дрэнна.

Штат фабрыкі раздуты, стаўкі празмерна высокія. Як вынік — фабрыка-кухня за восем месяцаў работы дала на 168 тыс. руб. страт.

А. ДАЎГУЧЬЦ, МІНЬКОВА, ЛЕВІН.

ПАДРАДЧЫК

(ПІСЬМО РАБОЧАГА)

Член профсаюза малятр Дорфман лічыць сябе рабочым, але-ж ніколі не працуе. Ён займаецца шматлікім падрадніцтвам.

У кастрычніку ён дагаварыўся з жыллёвым таварыствам «Комунар-асветнік» (Менск) атынкаваць і афарбаваць дом за 6500 рублёў. З гэтай мэтай ён наняў на падзённую работу атынкоўшчыкаў, маляроў і чорнарабочых, і выдаткаваў на аплату іх працы 4 тысячы рублёў. Такім чынам, на гэтым падрадзе ён атрымаў 2500 рублёў чыстага прыбытку.

За пабелку інтэрната гідратэхнікума Дорфман атрымаў 400 рублёў. З гэтых грошай ён, сам не працаваўшы, узяў сабе 150 рублёў, а астатнія выплаціў двум малярам і падсобнаму рабочаму.

ОРМАН.

ЦЯГАНІНА

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

Вы ў чачэрскім аддзяленні Дзяржбанка. Зварачаецеся да кіраўніка ці галоўнага бухгалтара. Не паспееце яшчэ сказаць слова, як атрымліваеце прапанову прыйсці на другі ці трэці дзень. Такім чынам, на адной справе даводзіцца хадзіць некалькі дзён.

Бывае іншы раз вам і ўдзецца атрымаць візу кіраўніка на грашовым дакуменце. Тады вы ідзеце далей. Але і тут натыкаецеся на новую непрыемнасць.

— Таварыш Саўчанка, правядзіце, калі ласка, мой чэк.

— Паспееш, няма часу, — адказвае Саўчанка, а сама ў гэты момант выглядае ў акно на туманнае надвор'е.

— Не магу чакаць.

— Няма часу чакаць? Ідзі, прабе не трымаю. — Так адказала яна работніку ОРС'а.

Кантралёр Главарова вельмі доўга затрымлівае на сваім сталочэкі, якія даюць ёй наведвальнікі для перадачы ў касу.

Так тут пастаўлена работа.

А. ПЕРНІКАЎ.

30 снежня наркомлес СССР тав. С. С. ЛОБАЎ прыняў беларускую дэлегацыю стаханаўцаў лесу. На здымку злева направа — першы рад: ДРОЗД П. Г. — парторг Клічаўскага леспрамгаса, ДЫДО К. Ф.— дзесятнік Клічаўскага леспрамгаса — ініцыятар стаханаўскага руху на лесазагатоўках БССР, ШАПІРА І. Л. — возчык Асіпавіцкага леспрамгаса, АЗАРКЕВІЧ Г. Н. — грузчык Уздзенскага леспрамгаса, СТАДНІКАВА Л. Д. — гонтарэзчыца Барбруйскага леспрамгаса; другі рад (сядзяць): ФІЛІПАЎ А. А.—возчык Аршанскага леспрамгаса, ПАЎЛОЎСКІ — шофер-газагенератаршчык Барысаўскага леспрамгаса, тав. С. С. ЛОБАЎ, ПОЗНЯК В. В.—машыніст Нёманскай веткі, ФІЛОНАЎ В. Е. — шофер Рэчыцкага леспрамгаса; трэці рад (стаяць): ФЛЕРОЎСКІ І. П.—рэдактар газеты «Лесная промышленность», САЧКОЎ (Главюгаплес), ТРЭЦЮХІН А. І. — упоўнаркамлес па БССР і кіраўнік трэста Лесбел, ГРЫГОР'ЕЎ А. Г. — трактарыст Асіпавіцкага леспрамгаса, КУР'ЯНАЎ С. А. — шпалярэз Полацкага леспрамгаса, МІХАСЕНКА Е. П.—інжынер трэста Лесбел, МАЦІЛЕЦКІ —нам. начальніка Главюгаплеса, ДАНІШЭЎСКІ К. Х. — начальнік Главюгаплеса, ПІЛІК Н. А. — песаруб Асіпавіцкага леспрамгаса, ШУЛЬГІН М. А. — дырэктар Барысаўскага леспрамгаса, СТАНКЕВІЧ Д. С.—шпалярэз Барысаўскага леспрамгаса; чацвёрты рад—ЗАМОНІН (Главюгаплес), САЛАЎЁЎ—галоўны інжынер Главюгаплеса, НІМЕРОЎСКІ— (Главюгаплес), ВІНАКУР (Наркомлес), ЦІСЛЕНАК І. Г. — песаруб Асіпавіцкага леспрамгаса, ІЛЬІНЧЫК Ф. Я. — песаруб Клічаўскага леспрамгаса, ШЭЙН — парторг Главюгаплеса, ЛОПАТА М. М.—возчык Рэчыцкага леспрамгаса.

Фото Вал. Палякова.

СТАХАНАЎЦЫ НА РАМОНЦЕ ТРАКТАРАЎ

Фактычна падрыхтоўка да рамонту трактарнага парку Мсціслаўскай МТС пачалася яшчэ тады, калі трактары працавалі ў полі. Там дэталёва вывучалі зношванне запасных частак і загадзя ведалі, колькі і якіх частак трэба даць на рамонт.

Майстэрня была своечасова падрыхтавана, а варштаты праверены да 1 кастрычніка.

У мінулым годзе тачыльны варштат даваў дрэнную прадукцыю. Токар Багачоў стаў дэталёва яго вывучаць. Ён знайшоў, што ў варштаце няправільна ўстаноўлена калонка па плоце, няправільна ўстаноўлен кранштэйн валіка шківаў. Усе гэтыя непаладкі Багачовым былі ліквідаваны. Павялічылася прадукцыйнасць працы.

К пачатку рамонту былі падрыхтаваны праточаныя валы, запасныя часткі і матэрыялы. Для ўдзелу ў рамонце мы выклікалі 6 брыгадзіраў менш вопытных. Кожны трактарыст, які прыводзіць свой трактар у рамонт, абавязан быў прамыць яго, выцерці, здаць чыстым. Трактарыст прымаў сам удзел у рамонце свайго трактара. Быў складзен графік рамонту і ўстаноўлен кантроль за яго выкананнем.

Апрача рамонтных брыгад былі вызначаны 2 чалавекі спецыяльна на заліўку падшыпнікаў, рамонт бакаў і радыятараў, кваліфікаваны інструментальшчык-слесар, які выконваў складаныя слясарныя работы, 2 слесары-мантажысты і электратэхнік, які рамантаваў дынамо, магніто, рабіў перамотку і інш. На точны і шліфоўны пыліндраў працавалі 2 кваліфікаваныя токары.

Усе астатнія аперацыі, як прыпальванне, працірка клапанаў, разборка і зборка трактара, рабіліся рамонтнай брыгадай.

Штодзень увечары праводзіліся дзесяцімінутныя вытворчыя нарады, у час якіх падводзіліся вынікі рабочага дня і давалася заданне на наступны дзень. Разультаты работы кожны дзень вывешваліся на спецыяльнай вытворчай дошцы.

Прамовы таварыша Сталіна на нарадзе стаханаўцаў, на нарадзе камбайнераў і камбайнерак і на прыёме пяцісотніц натхнілі лепшых людзей — стаханаўцаў МТС.

Токар Багачоў, трактарыст Казлоў, старшы механік Зайцаў, механік Рубінаў — вось тыя людзі, якія забяспечылі датэрміновае сканчэнне рамонту.

Паводле складзенага графіка, мы павінны былі скончыць рамонт 1 студзеня 1936 года, фактычна закончылі 17 снежня 1935 года — на тры месяцы раней супроць плана Наркамзема.

Паводле плана Наркамзема, мы павінны былі затраціць на рамонт 45.184 рублёў, затрацілі — 21.076. Гэта дало нам магчымасць зусім не браць грошай ад Наркамзема на рамонт і адмовіцца ад 8 тысяч рублёў банкаўскага крэдыту.

На працягу 2-х месяцаў мы ў сваёй майстэрні прапусцілі праз капітальны рамонт 12 трактараў, праз сярэдні — 28 і праз бягучы — 3 трактары. Гэта паказвае, якія велізарныя рэсурсы ёсць у кожнай машынатрактарнай станцыі.

НІКІФАРАЎ — дырэктар Мсціслаўскай МТС імя Кірава.

ВОЗЬМЕМ 500 ЦЭНТНЕРАЎ БУЛЬБЫ З ГЕКТАРА

У сваім калгасе «Большэвік» мы чыталі і абмяркоўвалі выступленне нашага любімага правадыра таварыша Сталіна на нарадзе перадавых камбайнераў і камбайнерак. У гэтай сваёй прамове таварыш Сталін паставіў перад усёй краінай задачу далейшага ўздыму ўраджайнасці.

Чытаючы яго прамову, мы ў сваім калгасе адразу паставілі канкрэтна пытанне, які адказ мы дамо таварышу Сталіну.

Гэты адказ мы далі не адразу, бо, як сапраўдныя гаспадары, мы павінны былі гэта пытанне дакладна вывучыць. І, атрымаўшы паведамленне, што перадавыя калгасы Маскоўскай вобласці ставяць перад сабой задачу атрымаць у наступным годзе 500 цэнтнераў бульбы з гектара, мы рашылі далучыцца да іх і на пастаўленую таварышам Сталіным задачу адказаць таксама 500 цэнтнерамі бульбы з гектара.

Усе магчымасці для гэтага ў нас ёсць. Трэба толькі прымяніць усе дасягненні сельскагаспадарчай навукі і калгаснай практыкі, забяспечыўшы сапраўды любоўны догляд за кожнай пасаджанай раслінай.

Мы ўжо не першы год з поспехам ужываем у калгасе на ўгнаенне торф, розныя кампосты, торфафекальныя ўгнаенні, попел, мінеральныя ўгнаенні. Мы маем ужо гатунковыя пасевы бульбы і зернавых. На шмат якіх участках мы сёлета атрымалі па 180—200 цэнтнераў бульбы з гектара.

Каб атрымаць 500 цэнтнераў бульбы з гектара, нам трэба ў сярэднім атрымаць з-пад кожнага куста 1,5 кілограма бульбы. Некаторыя кусты бульбы нам ужо сёлета давалі больш, чым 1,5 кілограма. Значыць, трэба дабіцца, каб такі ўраджай давалі ўсе да аднаго пасаджаныя кусты бульбы.

Мы вылучаем для гэтай мэты спецыяльны зямельны ўчастак і вылучым пастаяннае звяно адданых калгаснікаў, лепшых ударнікаў, якія будуць за ім даглядаць. Для бульбы па севазвароту прыходзяцца ўчасткі найбольш ранняга зяблева. За зіму падрыхтуем дастатковую колькасць тарфянога гною, а для гэтага пачынаем ужо цяпер вазіць на подпіл у канюшню і скотны двор кожны дзень па 4—6 вазоў добра прасушанага торфу. Мы маем торфафекальны кампост, які таксама будзем ужываць пад бульбу.

Нам не хапае мінеральных угнаенняў. Але не сумняваемся, што мы гэтае ўгнаенне дастанем.

У бліжэйшыя дні ў калгасе будуць праведзены пяцідзённыя курсы, якія дадуць калгаснікам паляводчых брыгад неабходныя веды па агратэхніцы бульбы. Мы распрацуем найлепшыя спосабы пасадкі бульбы, веснавой і летняй апрацоўкі глебы, прыменім яравізацыю бульбы. Ва ўсёй сваёй рабоце мы як след будзем раіцца з спецыялістамі.

Наша задача — атрымаць з вылучанага ўчастка 500 цэнтнераў бульбы з гектара. Не сумняваемся, што такую задачу здолеюць паставіць і з поспехам вырашыць і іншыя перадавыя калгасы нашага раёна і ўсёй БССР.

Старшыня калгаса АДАМ ДУБЕНЬ, брыгадзір МАКСІМ ЯНКОЎ, інспектар па якасці ТАМАШ ДАЙНЕКА, гароднік МАЦЕЙ ШЭРШАНЬ, калгаснік-ударнік СЦЯПАН КАЧАН.
Калгас «Большэвік», Бышанскага сельсавета, Барысаўскага раёна.

ДЗІКУНЫ

Затхлы, цёмны і брудны пакоік. Ды гэта не пакоік, а клетка. У ім можна зрабіць толькі пару крокаў. Ля сцяны кароценькі палок, а на ім пасцель чорназёмнага колеру. Ля пасцелі стаіць, прыгорбіўшыся, старычок. У яго трасецца галава, трасуцца рукі. З-за акуляраў глядзяць пагасаючыя, поўныя трывогі, страху і непакою, вочы. Відаць, што ён нядаўна падняўся з пасцелі і намагаецца выпрастацца, бо на палку-ложку можна ляжаць толькі сагнуўшыся — ложак кароткі і вузкі.

Налева ад пасцелі — невялічкі столік. На ім абгарэлая бляшанка і акраец хлеба. Побач з хлебам— шыла і дратва. Ёсць яшчэ ў гэтым пакоіку разбітая табурэтка. Каля яе валяюцца шчарбатыя кацялы ды рваныя атопкі.

У гэтым брудным пакоіку, дзе з кожнага кутка вее цёмнай, гнілой восенню, ёсць адна мясцінка, на якую нібы скочыў сонечны зайчык. Сямідзесяцігадовы Аляксандр Гуд прыглядаецца з-пад акуляраў на фатаграфію, што вісіць каля самых дзвярэй. Гэта і ёсць кавалачак яго вясны. Даўным даўно зняўся Гуд са сваім сынам. І засталася дарагая памятка — фатаграфія маленькага радаснага сына з пажылым задуманым бацькам.

У старыка мацней затрэсліся рукі.

Ён выгадаваў сына, выгадаваў дачок...

І прыпомнілася яму былое, пражытае. Ён дзесяткі гадоў адзіў, тармазным на таварных вагонах, працаваў багажным рабочым. Мёрз, недасыпаў, галадаў. У самыя цяжкія гады падарвалася яго здароўе. З 1922 года пашоў на пенсію. Трэба было пракарміць сям'ю. Пенсіі неставала. І Аляксандр Гуд падзарабляў — працаваў сторажам, хадзіў часамі на падзённую работу.

Жылося цяжка. Але ніколі не пажадала яго надзея, што будзе лепш.

Выраслі Гудзавы дзеці. Выраслі і пра бацьку забыліся. Сын працуе столярам на менскім вагонабудаўнічым заводзе імя Мяснікова. Сын Алёша — адзіны ўлюбёны сынок у Гуда; ён пачаў жыць добра, самастойна, а пра бацьку забыўся. Дачка Оля працуе медсястрою ў нервовай клініцы. Яна не так даўно выйшла замуж. Ёсць цяпер у Гуда зяць — Ждановіч Аляксандр, студэнт Політэхнічнага інстытута. Дачка Алеся працуе бухгалтарам на тэлефонкай станцыі.

Усе дзеці жывуць самастойна, добра, а пра бацьку не дбаюць. І пры гэтай думцы ў Гуда мацней затрэслася галава.

Хіба-ж забыліся дзеці пра бацьку?

Вось нядаўна яны загналі яго ў цёмны куток. Зяць Ждановіч узяў лепшы пакой на кватэры Гуда, забраў лепшыя рэчы. Сын Алёша пасяліўся ў другім пакоіку, у які заходзіць бацьку сурова забаронена. Забаронена бацьку заходзіць і ў кухню.

Вось яшчэ нядаўна забралі ў яго апошні прымус і гарнчок для варыва. І цяпер стары Гуд грэе сабе ваду на чай у бляшанцы на жчэначках. Гуд было паткнуўся забраць прымус назад. Але дзеці ўзялі яго за грудзі, прывялі ў свой куток і прыгразілі:

«Ты ў нас, стары, глядзі»...

Бацька доўга пасля насіў сінякі і падрывіста кашляў.

Стары Гуд жыве ў клетцы-пакоіку. Тут сыра і холадна. Але ён росціць цёплыя надзеі, песціць думку, што можа дзеці паправяцца. І будзе ў яго чыста, цёпла, радасна, гэтак сама як у зяця Ждановіча, як у сына Алёшы.

На глыбокай старасці Гуд узяўся за новае рамяство — падшываe валенкі.

Дзеці не забыліся пра бацьку... Яны збегалі ў фінансавы аддзел і прасілі, каб на бацьку налажылі падатак: бацька шавец, ён нават абуткам гандлюе. У фінансавым аддзеле махнулі рукою. Дзецям стала ніякавата.

Аднойчы Гуд захварэў. Ён не пашоў да доктара. Пачаў сябе лячыць зеллем — наварыў чаборыку ды ліповага цвету.

У дзяцей бліснула новая ідэя. А ну-ж, цяпер і пазбавімся ад бацькі. І пабеглі яны заяўляць у міліцыю, што бацька знахар.

Але з гэтага нічога не вышла. Тады цэлы дзень барабанілі дзеці чым папала ў дзверы бацькоўскага пакоіка, штохвілінна паўтаралі:

— Ты ў нас, бацька, глядзі...

Стары Гуд, сагнуўшыся, падшывае валенкі. Ён хоча забыцца на ўсе гэтыя здзекі, на ўсе пагрозы. Але ў яго мацней пачынаюць трэсціся рукі і дрыжаць губы.

Ён чуе, як за сцяною пачынаюць спяваць яго любыя дзеці, Ён адкладае стары валёнак і прыслухоўваецца да песні.

Але-ж гэта спяваюць не дзеці, а дзікуны. Хіба-ж можна ў Совецкай краіне назваць дзецьмі тых людзей, якія зрабілі бацьку старасць цяжкой, горкай, невыноснай!

Совецкая грамадскасць і совецкі суд стануць на абарону старога, які правёў усё сваё жыццё ў працы і заслужыў спакойную і забяспечаную старасць. Ён будзе яе мець, гэты стары чыгуначнік Гуд, бо ў Совецкай краіне ёсць шмат сродкаў прымусіць дзяцей выконваць свае абавязкі перад старым бацькам.

С. ШУШКЕВІЧ.

ПІСЬМЕННІКІ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ІЛЬЯ ГУРСКІ

Ілья Данілавіч Гурскі яшчэ малады пісьменнік. За гады яго літаратурнай дзейнасці ім напісана 9 драматычных твораў — лічба не малая.

На арэне беларускай совецкай драматургіі Гурскі паявіўся ў 1928 годзе. Да літаратурнай дзейнасці драматург прайшоў складаны шлях. Сын селяніна-бедняка Уздзенскага раёна, Ілья Данілавіч у 1916 годзе — рабочы Обухоўскага сталеліцейнага завода. У 1919 годзе ён у Чырвонай арміі на Паўднёвым і Заходнім франтах. Ранены. У 1924 годзе—дэмабілізацыя, затым работа ў Наркомасветы, у Галоўрэперткоме, у Галоўліце, Галоўмастацтве, партыйная работа, вучоба ў аспірантуры Беларускай акадэміі навук.



«Новым шляхам» — п'еса для самадзейнага тэатра, якая напісана ў 1928 годзе, сюжэт якой адлюстроўвае барацьбу са старым бытам на вёсцы—першая нясмелая спроба пяра. Адсюль і ўсе якасці — пэўная недасканаласць сюжэту, мастацкіх сродкаў выяўлення. «Дрыгва» — наступны, больш смелы крок пісьменніка. Тэма — калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Голас набывае больш палкасці. Адчуваецца імкненне авалодаць вышынямі «тэатральнай і драматургічнай спецыфікі».

Распе нянавісць да класавага ворага, да буржуазных напяналістаў, інтэрвентаў, да іх друзей з партыйным білетам у кішэні. Сканцэнтраваная страсць — нянавісць да ворага, любоў, бязмежная любоў да сваёй радзімы, да партыі Леніна—Сталіна нараджае «Качагары», якія выклікалі воўчы вый супроць драматурга-большэвіка, вый нацдэмаўскіх ваўкоў і ваўчанят «у авечай скуры».

У вострым драматычным памфлеце І. Гурскі паказвае скрыўленыя твары кулака, шкодніка, шпіёна, дыверсанта і інтэрвента. На выкрыццё ворагаў ён у п'есе мабілізуе рабочы калектыў качагараў прымежнай электрастанцыі, ламае апартунізм кіраўнікоў, у якіх адсутнічае якасць, «якая заразаслівая неабходна большэвікам» — рэвалюцыйная пільнасць. Але палкі голас драматурга яшчэ не поўнасцю ўвасоблены ў сродкі мастацкай выразнасці. Яшчэ не ўлічаны ўсе драматургічныя «каноны», часам рытарычна мова герояў, не дынамічны сюжэт.

Але «Качагары» зрабілі сваю гістарычную справу. «Гута» Кобеца, «Качагары» Гурскага і «Напор» Александровіча адкрываюць новы этап у беларускай літаратуры, этап станаўлення беларускай пролетарскай драматургіі.

Ілья Гурскі чула прыслухоўваецца да біення пульсу індустрыялізуючайся краіны. 1932 год. Ён піша «Новы горад». Паглыбляецца тэматыка — соцыялістычнае перавыхаванне чалавека ў працэсе стварэння соцыялістычных новабудоўляў. Якая ўдзячная задача для совецкага літаратара! Але труднасці перавыхавання героя суправаджаюцца труднасцямі творчага росту пісьменніка. Яшчэ захапляе экзотыка мовы беспрытульнага, яшчэ схематычны і малакроўны вобраз большэвіка. Аднак, драматург у працэсе творчасці вучыцца і на ўласных памылках і працягвае набліжацца да авалодання літаратурнымі вышынямі.

Усхваляваная палкасць драматурга накіроўваецца на «крэсы ўсходнія», дзе адбываецца барацьба супроць здзекаў белых паноў над беларускім працоўным людам, дзе чырвоныя партызаны змагаюцца супроць панскага бізуна. З'яўляецца п'еса «На крэсах усходніх».

Драматург робіць далейшыя творчыя пошукі. Ён палярае свой творчы кругазід і накіроўваецца за сюжэтам на слаўныя старонкі гісторыі барацьбы рабочага класа пад кіраўніцтвам вялікіх Леніна і Сталіна за дыктатуру пролетарыята. Напісана «Маці». Тэма—барацьба за дыктатуру пролетарыята на Беларусі.

Традыцыйны сюжэт сусветнай драматургіі — маці і двух сыноў —не ўмяшчае вялікую гістарычную тэму. Многа мастацкі неразгорнутых персанажаў. Недасканала адшліфавана мова. Драматург пачынае грунтоўна перарабляць п'есу.

Ілья Гурскі надзвычай працаздольны чалавек. Ён многа вучыцца. У яго сапраўды большэвіцкая настойлівасць да вучобы. Барацьба за авалодванне «канонамі» прыводзіць да перамогі. «Сваты» — камедыя з калгаснага жыцця для самадзейнай сцэны — лінія значнага росту пісьменніка. У актыве — новы жанр, камедыя інтрыгі, дэфіцытная ў беларускай драматургіі. Драматург авалодаў сюжэтам. Драматычныя сітуацыі сюжэтна абумоўлены. Узбагацілася мова, дыялаг пабудаваны на аснове фальклору, на аснове шырокага выкарыстання народных прыказак і выслоўяў. У дыялагу камедыі сапраўдны камедыйны гумар. Творчых недасканаласцей у гэтай п'есе значна менш. Рост драматурга-большэвіка відавочны. Гэта радуе.

Надыходзяць новыя вялікія задачы. Яны выцякаюць з велічы нашай эпохі.

М. МОДЭЛЬ.

ВЫКАНАН ГАДАВЫ ПЛАН АПРАЦОЎКІ ТРАСТЫ

ЧАШНІКІ. (Па тэлеграфу). Замацкі льнозавод гадавы план па доўгаму валакну выканаў на 146 проц., па турбінных адыходах — на 225 проц.

Дырэктар завода СІНЯЎСКІ.
Тэхкіраўнік ЗАХАРАЎ.
Заўком АЛЕЙНІКАЎ.

ПРАДАЎЖАЕМ ВЫДАЧУ АКТАЎ

СМАЛЯВІЦЫ. (Па тэлеграфу). Смалявіцкі раён на 31 снежня план, даведзены СНК БССР на 1935 год па выдачы калгасам дзяржаўных актаў на вечнае карыстанне зямлёй, выканаў поўнасцю. Падрыхтавана к выдачы звыш плана 16 калгасаў.

Старшыня райвыканкома А. ХАДАРКЕВІЧ.
Загадчык райза П. ПІШЧЫК.
Старшы землеўпарадчык М. ЛУК'ЯНАЎ.

МЯСА ЗДАНА ВЫШЭЙШАЙ ЯКАСЦІ

Саўгасы Гомельскага малакотрэста план мясаздачы ў 5.061 цэнтнер выканалі. Здана 5062 цэнтнеры мяса, з якіх вышэйшай якасці здана 20 проц. Саўгасы арганізавалі работу адкорму жывёлы і абавязаліся да тэрміну выканаць план мясаздачы першага квартала вышэйшай якасці.

Гомельскі малакотрэст
КАЗЫРЭЎСКІ, ДЫНДЗІН.

РАМОНТ ТРАКТАРАЎ СКОНЧЫЛІ НА 35 ДЗЁН РАНЕЙ ТЭРМІНУ

ЛЮБАНЬ. (Па тэлеграфу). Прапрацаваўшы прамову таварыша Сталіна і разгарнуўшы работу пастаханаўску, Любаньская МТС рамонт трактараў скончыла добраякасна і на 35 дзён раней тэрміну. Разгортваем работу па датэрміноваму сканчэнню рамонту ўсяго сельскагаспадарчага інвентару.

Дырэктар МТС ДУРКЕВІЧ, нам. дырэктара ГУРЭВІЧ, нам. па палітчастцы МЕНДЭЛЕЎ, рабкаром ПРАШЫЦКІ, старшы механік ШАРГУН, стаханаўцы СКРЫГАН, ВАРОНІЧ, ЧЭКАН.

НЕ МЕНШ 900 ГЕКТАРАЎ НА ТРАКТАР

Чэрыкаўская МТС у гэтым годзе выканала вытворчы план на 110 процантаў, значна знізіўшы сабекошт работ, зэканоміўшы 15.000 руб.

У адказ на прамову правадыра партыі таварыша Сталіна на нарадзе камбайнераў і камбайнерак трактарысты Чэрыкаўскай МТС абавязаліся ў 1936 годзе даць на кожны трактар у сярэднім не менш 800 гектараў. Лепшыя трактарысты тт. Кавалёў і Пухоўскі абавязаліся ўзарань за сезон на трактары «ХТЗ» не менш 900 гектараў.

ЗЯНЬКОВІЧ.

НОВЫ ГОД У СТАЛІЦЫ БССР

12 гадзін ночы. Па эфіру з Масквы данеслісь гукі «Інтэрнацыянала». Мільёны людзей нашай вялікай сацыялістычнай краіны, тысячы аркестраў у тэатрах, палацах і клубах падхапілі гімн. У гэту поўнач ён гучэў асабліва ўрачыста і пераможна.

...У клубе імя Сталіна тысяча рабочых кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка» ўсталі са сваіх месц і стройным хорам заспявалі «Інтэрнацыянал». У глыбі сцэны на вялікім свецячымся цыферблаце стрэлкі застылі на «12»: на совецкай зямлі наступаў новы шчаслівы 1936 год.

На ўсіх прадпрыемствах, ва ўсіх клубах радаваліся і весяліліся працоўныя сталіцы БССР. Фойе клуба імя Сталіна пераліваліся ўсімі колерамі вясёлкі. Розакаляровыя шары ўздымаліся над галовамі людзей. Са столі густой сеткай звісалі чырвоныя, сінія, зялёныя і другіх колераў істужкі. Адзенне ўсіх пасыпана канфеці. Спевы і танцы, радасны смех і весялосць, сотні шчаслівых твараў. Вось з'яўляецца работніца ў каснюме, на якім этыкеткі прадукцыі фабрыкі. На каснюме выдзяляецца яркі надпіс: «Жыць стала лепш, жыць стала весялей» Рабочы ў каснюме шахцёра, цікавы ўбор калгасніцы, мноства жартлівых масак.

Каснюм і маска інжынера завода імя Кірава тав. Лапідуса былі аформлены на тэму: «Рост завода», сакратара комсамольскай арганізацыі тав. Гурвіча на тэму: «Фашызм». Рабочыя-кіраўны спявалі і танцавалі пад музыку свайго заводскага джаза. Вечар рабочых завода імя Молатава пачаўся агалашэннем прывітальнай тэлеграмы сакратара ВЦСПС тав. Палонскага на імя стаханаўцаў тт. Мільбоера і Цяўлоўскага. Рабочыя слухалі канцэрт падшэфнага тэатра оперы і балета.

У дамах і на вуліцах у радасным ліхаванні сустракалі новы год. Фейерверк і ракеты ўспыхвалі ў цёмным небе на адкрыцці катка швэйнай фабрыкі імя Крупскай. У сталовай фабрыкі адбыўся вялікі касцюміраваны балмаскарад. Чатыры новагоднія ёлкі былі наладжаны для дзяцей рабочых фабрыкі і ёлка на кватэры ў начальніка вышывальнага цэха тав. Кажок.

Тостам у гонар любімага правадыра таварыша Сталіна і яго саратніка тав. Кагановіча пачаўся новагодні банкет рабочых менскага чыгуначнага вузла. На хлебазаводзе была ўрачыстая вячэра, касцюміраваны бал, ёлка для дзяцей. Вячэра стаханаўцаў адбылася на фабрыцы «Кастрычнік». Алімпіядай самадзейнага мастацтва сустрэлі новы год рабочыя фабрыкі імя Кагановіча. Чыткай новагодніх віншаванняў дванаццаці стаханаўцам пачаўся вечар на заводзе «Большэвік». Бал адбыўся на заводзе «Ударнік» і на радзе іншых прадпрыемстваў горада.

Усюды весела і радасна працоўныя сустракалі новы шчаслівы год, усюды раздаваліся прывітанні ў гонар вялікага і любімага Сталіна, які даў народу радаснае і вясёлае жыццё, магчымасць смяяцца і радавацца ад усёй душы.

Новагодні бал-вечар

БАБРУЙСК, 2 студзеня. (БЕЛТА). 1.500 стаханаўцаў, гаспадарнікаў, спецыялістаў, партыйных і прафсаюзных работнікаў прышлі 31 снежня ў памяшканне гарадскога тэатра на новагодні вечар-бал. Рускі Дзяржаўны тэатр БССР і ТРАМ арганізавалі вялікі канцэрт. Пад музыку двух аркестраў танцавала каля 500 пар. Роўна ў 12 гадзін ночы сакратар райкома партыі тав. Чарнышоў вітаў прысутных з новым годам. Бурную авацыю наладзілі ўдзельнікі вечара ў гонар таварыша Сталіна.

Новагоднія вечары адбыліся на швэйнай фабрыцы імя Дзержынскага, на заводзе імя Сталіна, фанерным заводзе імя Томскага і інш.

Весела і радасна сустрэлі новы год дзеці — вучні 42 школы (Менск). У школе была арганізавана ёлка, упрыгожаная рознакаляровымі агнямі, цацкамі, цукеркамі і т. д. Дзеці-выдатнікі выступалі на вечары з песнямі, дэкламацыямі і танцамі.

На здымку злева ГУЛЕЦКАЯ і МІНЬКОВА — выдатнікі 7 класа — выконваюць танец. Фото САЛАВЕЙЧЫКА.

НОВЫ ГОД НА ПАЛЕССІ

МАЗЫР, 2 студзеня. (Кар. «Звязды»). Ва ўсіх раённых цэнтрах акругі 31 снежня ўвечары адбыліся ўрачыстыя пленумы гарадскіх і местачковых советаў сумесна з стаханаўцамі прадпрыемстваў. Пленуму Мазырскага гарадскога совета рапартавалі аб датэрміновым выкананні гадавога плана буйнейшыя прадпрыемствы горада: фанерны завод «Чырвоны Кастрычнік», лесазавод «Пролетарый» і мэблевая фабрыка «Профінтэрн».

31 снежня ўвечары і 1 студзеня ўдзень ва многіх гарадскіх і сельскіх школах, дзіцячых дамах і садах для дзяцей былі арганізаваны новагоднія ёлкі. Ёлкі таксама былі ва многіх рабочых кватэрах. Стаханавец хлебазавода тав. Махнаты запрасіў да сябе на ёлку ўсіх дзяцей дашкольнага ўзросту рабочых і служачых свайго завода, стаханавец завода «Пролетарый» тав. Табола—дзяцей ударнікаў завода. У вёсцы Слабада для калгасных дзяцей калгасаў «Чырвоны партызан» і «Калгаснік Мазыршчыны» была арганізавана ёлка ў Доме сацыялістычнай культуры; ёлкі адбыліся і ў радзе іншых калгасаў. Дзецям былі раздаены новагоднія падарункі.

СВЯТОЧНАЯ СУСТРЭЧА

ВІЦЕБСК, 2 студзеня. (Кар. «Звязды»). Вуліцы горада папярэдні і ў новы год былі па-святочнаму ажыўлены, дамы і клубы ўпрыгожаны партрэтамі правадыроў у электрычным святле і зелені. Бойка гандлявалі прадуктовыя і прамтаварныя магазіны, адкрыўся яшчэ адзін добра абсталяваны магазін «Гастраном». Асабліва ажыўленне назіралася ў дзіцячых магазінах, ёлкі і цацкі куплялісь нарасхват.

На фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі», у клубах металістаў і трыкатажнікаў адбываліся вялікія балы-маскарады. Рабочы калектыў завода «Комінтэрн» сустрэчу новага года адзначыў арганізацыяй стаханаўскіх сутак.

Весела сустракалі новы год дзеці. У Доме мастацкага выхавання дзяцей, у школах і дзячых садах былі арганізаваны новагоднія ёлкі. «Дзякуй Сталіну за вясёлае, радаснае жыццё»—усюды гэты лозунг гарэў яркім агнём электрычнасці. Кінатэатры, кафе-рэстаранны, клубы ў гэтыя дні былі перапоўнены.

ЛЫЖНАЯ ЭСТАФЕТА

1 студзеня на Усебеларускім стадыёне ў Менску адбылася новагодняя лыжная эстафета, прысвечаная адкрыццю зімовага сезона. У эстафеце прынялі ўдзел звыш 200 лыжнікаў сталіцы. Пераможцамі па першай групе выйшлі дынамаўцы. Мужчынская каманда ў складзе чатырох чалавек прайшла ўсе этапы эстафеты (20 кіламетраў) за 1 гадзіну 59 мінут 41 секунду, апачатая каманда ў складзе 3 чал. прайшла ўсе этапы (9 кіламетраў) за 1 гадзіну 20 мін. 29,8 сек. Другое і трэцяе месцы падзялілі каманды «Спартака» і М.-скай часці. Сярод вытворчых калектываў пярэшнства заваявала каманда саюза спіртаводачнікаў, другое месца—фабрыка «Кастрычнік» і трэцяе—саюз медсанпрацы. У групе вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў першае месца заняла каманда Інстытута народнай гаспаларкі, другое месца— медінстытут і трэцяе—тарфяны тэхнікум. Лепш за ўсіх прайшлі свае этапы тт. Гетманец (тэхнікум фізкультуры), Караґіна (Політэхнічны інстытут) і Аўсеенка («Спартак»). Каманды-пераможцы прэміруюцца пераходнымі прызамі. Эстафета праводзілася ў вельмі дрэнных для лыжнага спорту умовах, пры тэмпературы 3 градусаў цяпла.

НОВАГОДНІЯ ЁЛКІ

Велізарныя пышныя дрэвы, якія верхазінамі краналіся столі, былі багата ўпрыгожаны. На ёлках «выраслі» яблыкі, цукеркі, пячэнне, розныя цацкі. Прыгожую ёлку зрабілі ў піонерскім атрадзе 4-га класа 5-й менскай школы. Яе галінкі абвілі рознакаляровыя істужкі. Пазалочаныя арэхі, цацкі, ласункі, блёсткі ў святле рознакаляровых электрычных лямпак надавалі ёлцы багаты выгляд. Вакол ёлкі дзеці вадзілі карагоды, пелі, плясалі, выступалі з нумарамі мастацкай самадзейнасці. У Беларускім дзіцячым доме тры дні надрад наладжвалі дзецям прыгожа ілюміраваную ёлку. Ніз ёлкі ўслалі белай, ватай, абсыпалі блёсткамі, у налітых вадой талерках плавалі лебедзі і рыбкі. Вечары заканчваліся раздачай дзецям падарункаў.

БЕЛАРУСКАЯ КАПЕЛА

Пры Наркомасветы БССР арганізавана беларуская капела з 50 спевакоў, якая ўжо распачала работу. Апрача кваліфікаваных вакалістаў, у складзе капелы ёсць удзельнікі мастацкай самадзейнасці прадпрыемстваў сталіцы, як наборшчыца друкарні СНК БССР тав. Гоберман, работніца завода «Большэвік» т. Куніцкая і інш. Капела рыхтуецца да канцэртных выступленняў у гарадах, калгасах і соўгасах БССР. У яе рэпертуары творы беларускіх кампазітараў, рэволюцыйныя і клясічныя спевы, беларускі і яўрэйскі фальклор. Капелай кіруе кампазітар Палонскі. (БЕЛТА).

ПУЦЁЎКІ ВУЧНЯМ У ДАМЫ АДПАЧЫНКУ

Каля двух тысяч вучняў, галоўным чынам дзяцей стаханаўцаў фабрык і заводаў БССР, атрымалі новагоднія пуцёўкі ў дамы адпачынку і санаторныя пляцоўкі. Дзеці прабудуць там увесь канікулярны час. Разам з дзецьмі выязджаюць педагогі і піонерработнікі.

—о—

КАЛГАСЫ БССР АТРЫМАЛІ 200 АЎТАМАШЫН

Да новага года 200 калгасаў БССР атрымалі аўтамашыны за праданыя дзяржаве ў IV квартале лішкі хлеба. Машыны завезены на месцы. У студзені-сакавіку калгасы БССР атрымаюць яшчэ 150 грузавых аўтамашын.

КОРАТКА

(Ад карэспандэнтаў «Звязды» і БЕЛТА)

* Грамэта Народнага камісарыята асветы БССР і каштоўны падарунак выдаюцца артыстцы Рускага дзяржаўнага тэатра БССР Е. І. Стралковай у сувязі з 50-годдзем яе сцэнічнай дзейнасці (гл. «Звязду» ад 28 снежня). Адначасова Наркамат асветы ўзбудзіў хадайніцтва аб назначэнні тав. Стралковай персанальнай пенсіі.

* Поўаўтаматычная тэлефонная станцыя ў Гомелі, аданая сёлета ў эксплаатацыю, на 1 снежня налічвае 1260 абанентаў, замест ранейшых 600 абанентаў. У гэтым годзе закончана тэлефанізацыя ўсіх сельсоветаў раёна.

* Электравальцавыя млыны ў Мазыры і Петрыкове вызначана пабудаваць у 1936 годзе. Кошт будаўніцтва кожнага млына — 500 тыс. руб.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Усім прапагандыстам, якія атрымалі ў снежні 1935 г. літаратуру (газеты і журналы) па спісу прапагандыстаў Менгаркома КП(б)Б і прапагандыстам, якія ўключаны ў гэты спіс упершыню (па вестках, прадстаўленых сакратарамі парткома), да 10 студзеня г. г. аформіць сваю падпіску на «Праваду» і «Звязду» на 1936 год і ўнесці падпісную плату за студзень па адрасу: вул. Карла Маркса, 10, Саюздрук (ад 9 гадзін раніцы да 6 вечара).

Тым, якія не ўнясуць падпісную плату за газеты да 10 студзеня, высылка газет будзе спынена.

Культпроп Менгаркома КП(б)Б.

5 студзеня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Дома партактыва (малая зала, уваход з вул. Энгельса) адбудзецца нарада прапагандыстаў Сталінскага раёна па пытанню становішча партвучобы.

ОРГБЮРО.

4 студзеня 1936 года ў 7 гадзін вечара, у Доме партактыва Менгаркома КП(б)Б (малая зала) адбудзецца кансультацыя тав. Гершона для прапагандыстаў і агітатараў — «Вынікі снежаньскага пленума ЦК ВКП(б)».

КІЖ БССР імя С. М. Кірава праводзіць дадатковы набор членаў КП(б)Б на 6-месячныя падрыхтоўчыя курсы.

Дакументы з камандыроўкай РК КП(б)Б павінны быць дасланы ў КІЖ (Менск, Чырвонаармейская, 8) не пазней 10 студзеня 1936 года.

ДЫРЭКЦЫЯ КІЖ'а.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Тэатральная зала клуба металістаў (вул. Кірава, 12, тэл. 25-384)
СПЕКТАКЛІ АБЛАСНОГА ТЭАТРА МУЗКАМЕДЫІ
Заходняй вобласці
Сёння, 3 студзеня, СПЕКТАКЛЮ НЯМА
Заўтра, 4 студзеня, „РОЗ-МАРИ"
Білеты, купленыя на 3 студзеня, сапраўдны на 4 студзеня.
Пачатак у 8 гадзін.

Новае дасягненне совецкай кінематаграфіі
ХУТКА! НА ЭКРАНЕ ХУТКА!
гукавога кінотэатра „ПРОЛЕТАРЫЙ"
АМЕРЫКАНСКІ ГУКАВЫ ФІЛЬМ
на рускай мове па раману Герберта Уэльса
Чалавек-невідзімка
Дубляж (перазапіс на рускую мову) зроблен навукова-даследчым кіно-фотоінстытутам (НІКФІ),

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
ад 2 студзеня 1936 г.
Гукавы мастацкі фільм вытворчасці «Ленфільм»
У галоўных ролях:
Заслуж. артысты рэспублікі
Б. Паўлоўскі, Граноўскі, Тапаркоў, Кміт.
ГРАНІЦА
У праграме кінохроніка Саюзкіно
„СТАРОЕ ДУДЗІНА"

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1
Сёння. 3 студзеня, КАНЕЦ ДРУЖБЫ
Пачатак у 8 г. веч
Білеты прадаюцца ў касе тэатра

ГУКАВЫ КІНОТЭАТР «ПРОЛЕТАРЫЙ»
Гукавы мастацкі фільм ЗАЛАТОЕ ВОЗЕРА

Гукавы кінотэатр „Чырвоная зорка"
Музыкальная камедыя Вясёлыя рэбяты

Кіно «СПАРТАК»
Ад 3-га студзеня выдатны фільм
«ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЦЁ»
(нямы варыянт).
Драма ў 9 частках.
У праграме — кінохроніка.
Штодзённа 4 сеансы. Каса з 4-х гадзін дня.

Менскі двухгадовы настаўніцкі інстытут нацменшасцей,
які падрыхтоўвае настаўнікаў для няпоўнай сярэдняй школы па мове і літаратуры, гісторыі і геаграфіі, фізіцы і матэматыцы
абвяшчае набор
на падрыхтоўчыя курсы на рускае, яўрэйскае і польскае аддзяленні.
Паступаючыя на курсы прымаюць іспыты па беларускай мове, матэматыцы, фізіцы, геаграфіі, грамадазнаўству і па роднай мове і літаратуры за 8 класаў сярэдняй школы.
Залікі пачынаюцца з 13 студзеня 1936 года з 3 гадзін дня.
Усе студэнты, прынятыя на курсы, забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам не забяспечваюцца.
Заявы аб прыёме на курсы з усімі адпаведнымі дакументамі накіроўваць на адрасу:
Менск, Валадарскага, 5, настаўніцкі інстытут нацменшасцей.
ДЫРЭКЦЫЯ.

4 студзеня, у 7 гадзін вечара, у канферэнцзале Беларускай акадэміі навук (пр. Леніна 1 і Кірава 29/35) адбудзецца
публічнае абарона дысертацыі т. Пеккер М. С.
на ступень кандыдата біялагічных навук на тэму: «К тэарэтычным основам яравізацыі і дынгностыка яравізацыі».
Афіцыяльны апанент праф. Годнеў Ц. Н.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Усім установам і прадпрыемствам г. Менска.
Цэнтральны совет Асоавіяхіма БССР паведамляе, што
Менскі стралковы клуб часова закрыт.
Усякае заключэнне дагавораў паміж установамі і стралковым клубам часова спынена. Усе разлікі па запазычанасці стралковаму клубу (за патроны, значкі і т. д.) просьба праводзіць праз дзяржбанк, бягучы рахунак № 160 9550, або праз касу Цэнтральнага совета Асоавіяхіма — вуліца Энгельса, 28.
ЦС АСОАВІЯХІМА БССР.

На падставе загаду беларускага трэста «Главхлеба» НКХП СССР ад 29-XII-1935 г. за № 262,
Менскі камбінат хлебапячэння
„МЕНСКІ ХЛЕБАКАМБІНАТ"
з 1 студзеня 1936 г. рэарганізуецца.
Усе прэтэнзіі як пакупнікоў, так і іншых арганізацый, установ і т. д., павінны быць прад'яўлены не пазней 15 студзеня 1936 г. па адрасу: г. Менск, Н.-Ракаўская вуліца, дом № 17-19.
Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

Я принимаю
ВИТАМИНОЛЬ
лучшее незаменимое средство при рахите
(предупреждение и лечение)
НКЗдрав Москва
Доза — 5-15 капель
Ф-ка эндокрин. препарат
Требуйте во всех аптеках и магазинах Сангигиены.

КОНТРАЦЕПТИН
ПРОТИВОЗАЧАТОЧНЫЕ ШАРИКИ НА ХИНОЗОЛЕ
Рекомендовано Центр. Научн. Комит. Наркомздрава по борьбе с абортами
1-е место среди профилактических препаратов ГАУ НКЗдрава РСФСР
ПРОДАЖА ВО ВСЕХ АПТЕКАХ И МАГАЗИНАХ САНГИГИЕНЫ

Марына-Горскаму сельскагаспадарчаму тэхнікуму патрэбны
ПАТОЗОНЫ ВЫКЛАДЧЫКІ
механізацыі сельскай гаспадаркі, хіміі,
чарчэння і геадэзіі.
Аплата згодна палажэння, нагрузка поўная.
Заявы прымаюцца да 20 студзеня.
Адрас: станцыя Пухавічы, Марына-Горскаму сельскагаспадарчаму тэхнікуму.

Калектыў работнікаў Беларускага інстытута эканомікі сельскай гаспадаркі з глыбокім жалем паведамляе аб смерці старога большэвіка
Г. А. БРЫТОВА
і выказвае спачуванне яго сям'і.
Пахаванне адбудзецца 3-га студзеня ў 2 гадзіны дня.

ЗГУБЛЕНЫЯ І ЎКРАДЗЕНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМІ:

Пашпарт ГУБІНА К. С., студэнцкае пасведчанне — КРАСОЎСКІ Т. Д., профбілет — ШПАК І. Д., пашпарт — НОВАХРЭСТ А. П., профбілет — ПЕКАРЧЫК А. С., пашпарт — ГАЛІНСКАЯ Б. М.

БАЛАНС

гаспадарчых сродкаў Беларускага тарфянога трэста пры НКМП БССР

на 1 студзеня 1935 г. і параўнанне яго з данымі бухгалтарскага балянса на 1 студзеня 1934 г.

АКТЫЎ	СУМА На 1-1-34 г.	СУМА На 1-1-35 г.
I. АСНОЎНЫЯ СРОДКІ		
1. Асноўныя сродкі вытворч. значэння	6612027—38	8552540—18
2. Асноўныя сродкі невытворч. значэння	3800116—51	5456331—90
Усяго па I раздзелу:	10412143—89	14008872—08
II. ВЫТВОРЧЫЯ ЗАПАСЫ НА СКЛАДЗЕ І Ў ПУЦІ		
1 Сыравіна, асноўн. і дапаможн. матэрыялы і тара	1265828—65	1551260—05
2. Паліва	141046—07	67391—51
3 Абсталяванне для устаноўкі	82141—47	38353—04
Усяго па II раздзелу	1489016—19	1657004—60
III. НЯСКОНЧАНАЯ ПРАДУКЦЫЯ		
1. Астача няскончанай вытворчасці і поўфабрыкаты	1608256—24	231503—89
2. Няскончаныя капітальн. работы	2297191—59	2686913—03
Усяго па III раздзелу:	3905447—83	2918416—92
IV ТАВАРНЫЯ ЗАПАСЫ		
1. Тавары і фабрыкаты на складах і ў пуці	1639644—04	5213920—51
2 Тавары адгружаныя і неаплочаныя	160024—71	350072—99
3 Матэрыялы для рэалізацыі і неліквіды	26917—94	34221—99
Усяго па IV раздзелу	1826586—69	5598215—49
V. ГРАШОВЫЯ СРОДКІ		
1. Разлікі і асобн. рах. у крэд. устан.	93255—11	93684—95
2 Бягучыя рахункі ў крэдытных установах	13550—05	18295 42
3. Каса і грашовыя пераводы	89529—90	119528—73
Усяго па V раздзелу	196335—06	231509—10

(ПРАЦЯГ АКТЫВА)	СУМА На 1-1—34 г.	СУМА На 1-1—35 г.
VI. РАЗЛІКІ		
1. Падспраўзадачныя сумы	43817—78	24950—02
2. Дэбіторы	309498—70	182361—76
3. Няпэўныя даўгі	90420—40	61587—68
4. Разлікі з ОРС'ам падляг. размяшч.	—	4803—57
5. Выдаткі будучых гадоў	41801—24	69081—73
Усяго па VI раздзелу	485538—12	342784—76
VII. ВЫДЗЕЛЕНЫЯ СРОДКІ		
1. Каштоўныя паперы	1973000	15908—50
2. Пеі і акцыі		
Усяго па VII раздзелу	1973000	15908—50
VIII. СТРАТЫ		
1. Страты за справаздачны перыяд	2886667—66	3715219—60
Усяго па VIII раздзелу	288667—66	3715219—60
БАЛАНС	21221465—44	28487931—05
ПАСІЎ		
I. УНУТРАНЫЯ РЭСУРСЫ		
1. Статутныя фонды	13033519—59	18371721—73
2. Матавыя фонды:		
а) фонд амартызацыі	1709261—28	1304100—68
б) іншыя	26498—97	46318—73
3. Рэзервы:		
а) няпэўныя даўгі	90420—40	39080—38
б) іншыя	572897—08	1969218—55
в) інш. рэгулюч. артыкулы	3334—56	89755—41
Усяго па I раздзелу	15435931—88	21820195—43
II. ПАЗЫКОВЫЯ СРОДКІ		
1. Доўтатэрміновае крэд.	3422784—64	2946320—51
2. Кароткатэрміновыя крэдыты	630480—00	2663481—10
3. Крэдыторы	732268—92	1057934—01
Усяго па II раздзелу	5785533—56	6667735—62
БАЛАНС:	21221465—44	28487931—05

СТРАТЫ РЭЗУЛЬТАТЫ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ за 1934 г. НАКАПЛЕННІ

СТРАТЫ	
1. Страты ад рэалізацыі тавараў і ад аказаных паслуг	2181658—39
2. Страты ад стыхійных бядот	5882—59
3. Страты ад спісання безнадзейных даўгоў і за пропускам тэрмінаў даўнасці	46970—08
4. Іншыя страты	1383643—77
5. Страты мінулых гадоў	405619—38
Усяго руб.	4023774—21

НАКАПЛЕННІ	
1. Накапленні ад паступлення па безнадзейных даўгах і ад спісання крэдыторскай запазычанасці за пропускам тэрмінаў іскавой даўнасці	148985—63
2. Іншыя накапленні	100115—15
3. Накапленні мінулых гадоў	59453—83
Усяго руб.	308554—61
Чыстыя страты	3715219—60
Усяго руб.	4023774—21

Кіраўнік трэста КУЗНЯЦОЎ.

Начальнік справазд.-фінансав. аддзела ЗІБІЦКЕР.

Гэты баланс разгледжан і зацверджан справаздачна-балансавай камісіяй НКМП БССР (прат. № 16 ад 2/IV 1935 г.) і да друкавання дазволен.

За нач. адд з. фінанс. і бухг. НКМП БССР КАЗОЎСКІ.

Уп. Галоўлітбела № К—3. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Тыраж 111960.